МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 53 (5727) | 5 сакавіка 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Пастанова Савета Народных Камісараў БССР — Аб утварэнні цэнтральнай, акруговых, гарадскіх і раённых камісій па барацьбе з паводкай і лёдаходам.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — У вышэйшы клас работы!

Мілонаў — Да III усебеларускага з'езда Асоавіяхіма.

А. Лаўрэцкі — Нікалай Васільевіч Гогаль.

Праф. Н. А. Дарожкін — Стаханаўцы ўносяць прапаўкі ў агратэхніку бульбы.

С. Сямашка — У Талачыне пакрываюць ворагаў народу.

Б. Зельманаў — Урокі Дрысы.

Г. Рагінская — Да пастаноўкі ў Менску «Свадьбы Фігаро».

АГЛЯД ДРУКУ — Зборнік пастаноў.

За рубяжом:

На франтах Іспаніі;

Германскія інтрыгі ў Турцыі;

Знешняя палітыка Чэхаславакіі;

Вялікі антыфашысцкі мітынг у Варшаве;

Арышты і вобыскі сярод левых польскіх сацыялістаў;

У ВЫШЭЙШЫ КЛАС РАБОТЫ!

Сёння адкрываецца III усебеларускі з'езд Асоавіяхіма. Энтузіясты абароны — прадстаўнікі ад 200 тыс. членаў баявога таварыства Асоавіяхіма Беларусі падвядуць вынікі, вызначаць баявую праграму далейшай абароннай работы на карысць ягчэ большага ўмацавання абароназдольнасці нашай пудоўнай квітнеючай радзімы.

— Абарона бацькаўшчыны ёсць свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна СССР. Гэтыя словы запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі — Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, у свядомасці, плоці і крыві кожнага грамадзяніна нашай радзімы. З гэтым свяшчэнным пачуццём совецкага патрыятызма ў буру, снегапад, цемру, слоту, не гледзячы на ніякія перашкоды рабочыя, работніцы, калгаснікі, калгаснікі разам са слаўнымі пагранічнікамі зорка спрагуць совецкія граніцы, затрымліваюць лютых ворагаў, шпіёнаў, дыверсантаў, мацуюць нашы граніцы ператвараючы прадпрыемствы, соўгасы калгасы, жакты **ў непрыступную крэпасць абароны.**

Гэта свяшчэннае пачуццё совецкага патрыятызма штодзённа і штогадзіна можна наглядаць ва ўсіх кутках нашай рэспублікі. Яно выражаецца ў штодзённай любві і клопатах аб сваёй роднай Чырвонай Арміі, у энтузіязме, з якім уступаюць прапоўныя ў сваё баявое таварыства Асоавіяхім, авалодваюць ваеннымі седамі, у абаронных паходах, у страсным захапленні нашай моладзі без адрыву ад вытворчасці вывучыць усе віды ваеннага мастацтва.

Наша добраахвотнае таварыства Асоавіяхім мае дасканалую глебу для сваёй работы. Працоўныя совецкай краіны, выхаваныя партыяй Леніна—Сталіна, у бязмежнай любві да радзімы, ствараюць магутны атрад людзей, якія ніколі не ведаюць страху ў баю, ніколі не даюць літасці ворагу.

Беларуская арганізацыя Асоавіяхіма дабілася за апошнія гады ўзлыму ў сваёй работы. Знішчаны буйныя недахопы, якія ў мінулым мінулым наглядаліся ў асоавіяхімаўскіх арганізацыях рэспублікі.

Пры дапамозе партыйных арганізацый падабраны і падрыхтаваны кадры, праведзена вялікая работа па перарэгістрацыі членаў таварыства, у выніку якой многа ініцыятыўных і энергічных людзей — стаханаўцаў энтузіястаў абароны прышлі да кіраўніцтва первічнымі асоавіяхімаўскімі арганізацыямі. Гэтыя людзі ўнеслі ажыўленне ў работу таварыства. Аўтарытэт арганізацыі, члена Асоавіяхіма ўзрос.

Прыкметныя поспехаў дабілася асоавіяхімаўская арганізацыя ў рабоце аэраклубаў, падрыхтоўцы без адрыву ад вытворчасці лётчыкаў, парашутыстаў. Шырацца ралы значкістаў абароны, калгасных кавалерыстаў. Абаронныя паходы ў працівагазах, процівіпрытных касцюмах, на лыжах, тактычныя ваенныя ігры, стралковыя спаборніцтвы сталі частым з'явішчам, у асаблівасці сярод моладзі.

Вяліжую работу пачаў Асоавіяхім па падрыхтоўцы насельніцтва да процівапаветранай і хімічнай абароны.

Але праробленая работа арганізацыямі Асоавіяхіма ягчэ не задавальняе патрабаванняў партыі. Арганізацыі Асоавіяхіма не ахапілі сваёй работай нават усіх жадаючых атрымаць ваенныя веды. Гэты факт — жывы дакор Асоавіяхіму рэспублікі, якая знаходзіцца на мяжы з капіталістычным захадам.

Асоавіяхімаўскія арганізацыі павінны перайсці ў вышэйшы клас сваёй работы. Тое, што зроблена, зараз ужо недастаткова. Трэба шырокія масы рыхтаваць да актыўнай абароны, разгарнуць масавую абаронную работу сярод усяго насельніцтва літаральна ва ўсіх кутках нашай рэспублікі.

Ператварыць кожнае прадпрыемства, МТС, калгас, соўгас, жакт у крэпасць абароны — баявая задача Асоавіяхіма. У гэтай галіне ягчэ прадстаіць вельмі многа работы. Нарастанне ваеннай небяспекі патрабуе, каб усякае наша соцыялістычнае прадпрыемства, калгас альбо іншы аб'ект быў цалкам і поўнасцю абароназдольным.

Практычная падрыхтоўка народных мас да абароны павінна быць рэзка палепшана. Нельга спыняцца на ваенных велах у аб'ёме першай ступені. Зараз патрэбна рыхтаваць членаў Асоавіяхіма і ў аб'ёме другой ступені, у дасканаласці валодаючых самалётам, танкам, кінём, вінтоўкай, працівагазам. Павінны быць падрыхтаваны з членаў Асоавіяхіма інструктары па розных відах ваеннай справы, якія-б навучалі ўноў уступлючых членаў Асоавіяхіма вайсковым ведам.

Дапрызыўны пункт Асоавіяхіма павінен быць ператвораны у сапраўдную кузню падрыхтоўкі письменнага ў ваенных і палітычных адносінах папаўнення для Чырвонай Арміі. Сюды павінны быць кінуты лепшыя сілы, тут павінна быць сканцэнтравана галоўная ўвага работнікаў райсоветаў Асоавіяхіма.

Каштоўная ініцыятыва первічных асоавіяхімаўскіх і комсамольскіх арганізацый Слуцкай акругі па арганізацыі ў калгасах, соўгасах і МТС хат абароны падхоплена радам асоавіяхімаўскіх арганізацый рэспублікі.

Хаты абароны павінны стаць цэнтрам абароннай работы ў вёсцы. Але мала арганізаваць хату абароны, абсталяваць яе, трэба, каб у ёй работа вялася. Некаторыя старшыні райсоветаў Асоавіяхіма думаюць, што іх задача заключаецца ў тым, каб стварыць хату абароны, а аб рабоце ў ёй можна не турбавацца. Наадварот, арганізацыя хат абароны патрабуе ад райсоветаў Асоавіяхіма штодзённага кіраўніцтва, дапамогі калгаснікам у наладжванні сістэматычнай работы па авалоданню вайсковымі ведамі.

Асоавіяхім — гэта добраахвотнае таварыства патрыётаў совецкай радзімы, якія аб'яднаны пачуццём адданасці і любві да радзімы, партыі, урада і вялікага правадыра таварыша Сталіна. Члены Асоавіяхіма — гэта актыўныя ўдзельнікі нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Яны непрымірымы да ворага, яны пільна сочаць за прошукамі яго. Яны вывучаюць вайсковую справу не для забавы, а для таго, каб метка біць ворага, які пасмее напасці на свяшчэнную бацькаўшчыну.

На поллыя дзеянні прэзрэннай трацкісцка-фашысцкай падалі совецкі народ адказаў новым уздымам абароннай работы. Гэты ўздым трэба замацаваць, перайсці ў новы, вышэйшы клас работы, каб быць гатовым не толькі адбіць націск ворага на нашу зямлю, але і назаўсёды адбіць у яго ўсякую ахвоту выпрабоўваць сілу збройі соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Большэвіцкае прывітанне патрыётам совецкай радзімы, удзельнікам III усебеларускага з'езда Асоавіяхіма!



Аня Чыкунова і Огінт Галя без адрыву ад вытворчасці навучаліся пры Менскім аэраклубе імя Молакова. Яны скончылі вучобу і здалі экзамен на «выдатна». НА ЗДЫМКУ: тт. Чыкунова Аня (злева) і Огінт Галя каля самалёта.
Фото Я. Салавейчыка.

НА ФРАНТАХ ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 4 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамленняў з Іспаніі, рэспубліканцы трымаюць ініцыятыву ў аперацыях на мадрыдскім фронце і занялі ў ноч на 2 сакавіка новыя пазіцыі ў раёне ракі Тахо. Мяцежнікі панеслі вялікія страты. Рэспубліканцы захвацілі значную колькасць вінтовак.

У раёне ракі Харамы (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) мяцежнікі прадпрынялі моцную атаку, якая была адбіта. Мяцежнікі панеслі сур'ёзныя страты. У прыватнасці, яны страцілі некалькі артылерыйскіх батарэй. Пасля чатырохгадзіннага бою яны вымушаны былі адступіць. Дзве роты мяцежнікаў палкам знішчаны.



Увечары 3 сакавіка мяцежнікі прадпрынялі атаку з мэтай захапіць зноў тэрыторыю каля Карупскай дарогі і ў раёне Эль Пардо (на паўночны захад ад Мадрыда), з якой яны былі выбіты. Пасля доўгага бою мяцежнікі адкінуты.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 3 сакавіка (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, рэспубліканскія войскі палепшылі свае пазіцыі на радзе франтоў.

Яны аказваюць націск на Толедо (на поўдзень ад Мадрыда), наступова захватваючы бліжэйшыя стратэгічныя пазіцыі. На фронце Кардовы (на поўдзень ад Іспаніі) урадавая артылерыя паспяховай бамбардыроўкай папярэдзіла наступленне мяцежнікаў, якое падрыхтоўвалася ў сектары Пасабланко (каля 70 кіламетраў на поўнач ад Кардовы).

У правінцыі Гранада 4 самалёты мяцежнікаў бамбардыравалі чыгуначную станцыю ў Андухары і затым зрабілі палёт на пазіцыі рэспубліканцаў па паўночным усходзе ад Кардовы. Адзін фашысцкі бамбардыроўшчык быў збіт. Экіпаж яго складаўся з 4 немцаў, з якіх тры забіты, адзін узят у палон.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), 3 сакавіка. (БЕЛТА). На астурыйскім фронце ў раёне Эскамплеро (на паўночны захад ад Овіедо) астурыйскія гарнякі пасля доўгага бою занялі пазіцыі мяцежнікаў на ўзвышшы Сан-Клаудыо і перарэзалі дарогу, па якой фашысты дастаўлялі ў Овіедо боепрыпасы. Мяцежнікі панеслі вялікія страты забітымі і раненымі і пакінулі на полі бою 6 кулямётаў, шмат вінтовак і некалькі скрынак патронаў. У Овіедо зараз ідуць моцныя баі ў раёне Санто-Домінго (усходняя частка горада). Не гледзячы на дрэннае надвор'е, рэспубліканская авіяцыя прадаўжае бамбардыраваць умацаваныя пункты мяцежнікаў.

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). На ўчарашнім сумесным пасяджэнні камісій па замежных справах абодвух палат чэхаславацкага парламента міністр замежных спраў Крофта выступіў з прамовай па бягучых пытаннях міжнароднай палітыкі.

Гаворачы аб адносінах з СССР, ён зноў падкрэсліў, што франка-совецкі і совецка-чэхаславацкі дагаворы аб узаемнай дапамозе былі заключаны, як чыста абаронныя дагаворы, у рамках Лігі нацый.

Крофта закончыў сваё выступленне заявай, што замежная палітыка Чэхаславакіі будзе і далей няўхільна праводзіцца па шляху захавання ўсеагульнага міру.

Вялікі антыфашысцкі мітынг у Варшаве

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 2 сакавіка. (БЕЛТА). Рад газет паведамляе аб адбыўшымся 28 лютага ў Варшаве антыфашысцкім мітынгу, скліканым ППС (партыяй польскіх соцыялістаў), на якім удзельнічала некалькі тысяч чалавек. Галоўнай тэмай выступленняў прамоўцаў была дэкларацыя палкоўніка Копа па поваду стварэння новай партыі фашысцкага тыпу.

Усе прамоўцы рэзка выказаліся супроць дэкларацыі Копа.

Аб настроях сабраўшыхся на мітынг газета «Głos poranny» піша:

«Раздаваліся патрабаванні аб'яднаных выступленняў рабочага класа, аб'яднання сіл дэмакратыі для сумеснай барацьбы супроць фашызма.

Удзельнікі мітынга патрабавалі ад прамоўцаў канкрэтных рашэнняў для ажыццяўлення адзінага пролетарскага і народнага фронта.

Улічваючы настрой сабраўшыхся, арганізатары мітынга, агаласіўшы рэзалюцыю, не адважыліся паставіць яе на галасаванне».

Арышты і вобыскі сярод левых польскіх соцыялістаў

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 3 сакавіка. (БЕЛТА). Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што варшаўскі акруговы суд па прапанове ўраднавага камісара Варшавы пастанавіў закрыць газету «Дзённік папулярны», выдаваемую дзеячом ППС (польскай соцыялістычнай партыі) Барліцкім.

Пракурор распарадзіўся зрабіць вобыскі і арышты сярод супрацоўнікаў рэдакцыі. Арыштавана 15 чалавек, сярод іх генеральны сакратар польскай «Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна» Юльян Маліньяк.

Згодна паведамлення газет, праведзена таксама вобыск у віднага члена ППС (польскай соцыялістычнай партыі) Дзюбуа, які ўзначальвае сумесна з заснавальнікам газеты «Дзённік папулярны» Барліцкім левую плынь ППС, што стаіць за стварэнне ў Польшчы адзінага і народнага фронта барацьбы супроць фашызма.

УСЕСАЮЗНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ПАГРАНІЧНІКАЎ

СВЕРДЛОЎСК, 4 сакавіка. (БЕЛТА). 3 сакавіка ў гарыстай мясцовасці пад Свердлоўскам пачаліся ўсесаюзныя лыжныя і стралковыя спаборніцтвы войск пагранічнай і ўнутранай аховы НКУС. З пагранічных застаў Украіны, Беларусі, Далёкага Ўсходу і іншых месц з'ехаліся пагранічнікі-фізкультурнікі. У спаборніцтвах гаксама прымаюць удзел жонкі начальніцкага састава. Учора на гарыстай мясцовасці адбылися лыжныя пераходы: для мужчын — на 30 кіламетраў і для жанчын — на 10 кіламетраў. Лепшыя рэзультаты сярод мужчын паказаў камандзір тав. Шышулін, які прайшоў гэту дыстанцыю ў 2 гадзіны 45 мінут 50 секунд. У пераходзе жанчын лепшае дасягненне ў тав. Максуповай — 55 мін. 43 сек.

Арктычны пералёт лётчыка Фарыха

МАСКВА, 4 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна вестак, атрыманых у Галоўным кіраўніцтве паўночнага марскага шляху, лётчык Фарых, які робіць вялікі пералёт па маршруту Масква — Уэлен — Масква, 4 сакавіка ў 4 гадзіны 45 мінут па маскоўскаму часу стартаваў з Якуцка на Верхне-Калымск.

У 6 гадзін 30 мінут самалёт Фарыха праляцеў Крэст — Хольджай (на Алдане).

На будаўніцтве Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі

МАСКВА, 3 сакавіка. (БЕЛТА). На будаўніцтве Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве зараз занята каля 3 тысяч рабочых. Ужо пракладзен водаправод і праведзена каналізацыя. Заасфальтавана 50 тыс. кв. метраў дарог. Апрача таго, трэба ягчэ заасфальтаваць 100 тыс. квадратных метраў дарог. Адноўлены пруды Пушкінскага парка. На адным з іх пабудавана паказальная калгасная гідраэлектрастанцыя. У бліжэйшы час выставачная тэрыторыя атрымае электрычны ток ад Сакольніцкай і Бутырскай падстанцый.

Скончана будаўніцтва 90 асноўных павільёнаў. Пачаты аддзелачныя работы.

Пашырэнне вырабу электрабытавых прылад

МАСКВА, 4 сакавіка. (БЕЛТА). Заводы Наркамняжпрома значна пашыраюць асартымент электрабытавых прылад. Харкаўскі электрамеханічны завод выпусціць першыя маленькія дарожныя электрапрасы. Яна вагою ў 400 грамаў.

Ленінградскі завод «Электрасіла» прыступае да выпуску партатыўных ручных пыласосаў для чысткі адзення, мэблі і дываноў. Электрачайнікі новай мадэлі пачне выпускаць завод «Электрык» (Ленінград). Ручкі ў іх будуць збоку.

Яраслаўскі завод «Красный Маяк» выпусціў пробныя камфортабельныя электракаміны новага тыпу. У гэтым годзе ў продажы паявяцца электрашчыпцы для завівкі валос.

ЗІМОВЫЯ ВУЧЭННІ Ў МАСКОЎСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУЗЕ

РАЁН ВУЧЭННЯЎ, 4 сакавіка. (БЕЛТА). Учора на сёння пачаліся зімовыя тактычныя вучэнні часцей Маскоўскай ваеннай акругі.

Раёны вучэнняў жывуць напружаным баявым жыццём. Ажылі пустынныя пералескі і паляны. Па дарогах і прасёлках рухаюцца стралковыя, кавалерыйскія, артылерыйскія і механізаваныя часці. К раніцы разгарнуўся бой за аўладанне горадам Н. Не гледзячы на ўпартае супраціўленне, «южане» пад націскам «северян» былі вымушаны адступіць. Удоўж шасэ і па палі расцягнулася лінія абароны «южан». Кулямётчыкі і стралкі ўмела скарыстоўваюць натуральныя ўкрыцці — дрэвы, загарадзі, хмызняк.

Камандзіры, не звёўшыя ў гэту ноч вачэй, упэўнена кіруюць баявымі аперацыямі. Чула і ўважліва яны адносяцца да патрэб байцоў.

Зладжанасць, дысцыпліна, арганізаванасць, ініцыятыва байцоў дапамагаюць з гонарам вырашаць складаныя тактычныя задачы ва ўмовах зімы. Актыўны ўдзел у баявых дзеяннях прымаюць механізаваныя часці. Дзве вялікія групы танкаў, атрымаўшы загад, рушылі на прарыў. Іх не маглі спыніць ні шматлікія рвы, ні ўзарваны на рэчках лёд. За кожным з танкаў на буксіры ішлі на лыжах па 15 чырвонаармейцаў. Вучэнні прадаўжаюцца.

„Манчэстэр гардыен" аб Эрнсце Тэльмане

ЛОНДАН (сталіца Англіі). 3 сакавіка (БЕЛТА). Ліберальная газета «Манчэстэр гардыен» пратэстуе ў перадавым артыкуле супроць трымання ў турме правадыра германскай компартыі Эрнста Тэльмана.

Газета заяўляе, што германскія фашысты памыляюцца, калі думаюць, што могуць трымаць Тэльмана ў турме ўсё жыццё, не пашкодзіўшы гэтым рэпутацыі Германіі. Пасля чатырохгадовага зняволення Тэльмана,—падкрэслівае газета,—яго не забылі і ніколі не забудуць, пакуль існуе ў свеце цывілізаванае сумленне.

Адстаўка фінляндскага ўрада

ГЕЛЬСІНГФОРС (сталіца Фінляндыі), 3 сакавіка. (БЕЛТА). У сувязі з уступленнем на пасаду новага прэзідэнта Каліо, фінляндскі ўрад падаў у адстаўку. Прэзідэнт дзяржавы Каліо прасіў урад астацца на пасту да сфармавання новага габінета.

Як паведамляе друк, прэзідэнт учора ўвечары запрасіў старшыню сейма (парламента) соцыял-дэмакрата Хакіла і меў з ім гутарку па пытанню аб сфармаванні новага ўрада. Хакіла заявіў прэзідэнту, што агульным жаданнем сейма з'яўляецца сфармаванне ўрада, які-б апіраўся на большасць сейма.

Сіяністы—саюзнікі польскіх фашыстаў

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 3 сакавіка. (БЕЛТА). Дзве сіяністкія палітычныя арганізацыі — «Брыт хахайялъ» і «Брыт трумпельдор» — заявілі аб сваім далучэнні да ствараемай палкоўнікам Копам новай фашысцкай партыі «Лагера нацыянальнага аб'яднання».

Трэба адзначыць, што гэтыя яўрэйскія буржуазныя арганізацыі паддтрымліваюць ідэолага яўрэйскага фашызма Жабатынскага і яго праграму эвакуацыі яўрэяў з Польшчы ў Палестыну. Да гэтай ідэі адносяцца вельмі спачувальна польскі ўрад і рэакцыйныя антысемітскія газеты.

Германскія інтрыгі ў Турцыі

Турэцкі друк зараз аддае вялікую ўвагу турэцка-германскім адносінам. Орган банкаўскіх колаў — газета «Тан» якая выходзіць у Стамбуле (буйнейшы цэнтр краіны, былая сталіца Турцыі) адзначае, што германа-турэцкі гандаль прыняў зацабаковы і выгадны толькі для Германіі характар і выклікаў цяжкае становішча турэцкага знешняга гандлю. Уся палітыка фашысцкай Германіі накіравана на ператварэнне Турцыі ў манапольны германскі рынак.

Германія купляе турэцкія тавары па цэнах ніжэй сусветных і прадае свае тавары Турцыі па цэнах вышэй сусветных. Прычым Германія манапольна скупляе турэцкую сыравіну разлічваючыся малакаштоўнымі «гнілымі» маркамі. Гэтым яна пазбаўляе Турцыю не толькі прыбытку валюты, але адрывае яе ад старых рынкаў збыту. «Тан» падкрэслівае што з таго часу, калі Германія стала амаль манапалістам у знешнім гандлі Турцыі, краіна пачала трапіць сваю эканамічную незалежнасць і ператварацца ў прыстатак германскай эканамічнай сістэмы.

Газета «Курун» таксама рэзка коўтыкуе фашысцкія метады германскага гандлю з Турцыяй. Гэты гандаль носіць выключна спекуляцыйны характар. Немцы скупляюць за бясцэнак турэцкія тавары і, карыстаючыся крэдытамі, перапродаюць іх старым кліентам Турцыі па высокіх цэнах. Недарма турэцкі цэнтральны банк спыніў фінансаванне гандлёвых аперацый з Германіяй. Гэта выклікана велізарным нагамаленнем запазычанасці Германіі па турэцкаму экспарту.

Газеты ўхваляюць эканамічныя меры супроць Германіі, прынятыя за апошні час турэцкім урадам.

Тая-ж газета «Тан» выкрывае фашысцкую кінапрапаганду на турэцкім экране. Газета піша: «Нам ужо абрыдзелі гэтыя струемыя ў кіно парады фашысцкіх ватажкоў, увесь паказны бок германскай «культуры», а таксама прамовы Гітлера і Герынга.

Газета «Акшам» указвае, што Германія, якая не падпісала канвенцыі аб праліўах у Лазане, настайвае чамусьці на агаворках да канвенцыі, якая заключана ў мінулым годзе ў Мантрэ. Урад,— піша газета, — павінен даць Германіі варты адказ.

Сёння ў нумары:

Пастанова Савета Народных Камісараў БССР — Аб утварэнні цэнтральнай, акруговых, гарадскіх і раённых камісій па барацьбе з паводкай і лёдаходам.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — У вышэйшы клас работы!

Мілонаў — Да III усебеларускага з'езда Асоавіяхіма.

А. Лаўрэцкі — Нікалай Васільевіч Гогаль.

Праф. Н. А. Дарожкін — Стаханаўцы ўносяць прапаўкі ў агратэхніку бульбы.

С. Сямашка — У Талачыне пакрываюць ворагаў народу.

Б. Зельманаў — Урокі Дрысы.

Г. Рагінская — Да пастаноўкі ў Менску «Свадьбы Фігаро».

АГЛЯД ДРУКУ — Зборнік пастаноў.

За рубяжом:

На франтах Іспаніі;

Германскія інтрыгі ў Турцыі;

Знешняя палітыка Чэхаславакіі;

Вялікі антыфашысцкі мітынг у Варшаве;

Арышты і вобыскі сярод левых польскіх сацыялістаў;

ДА III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА АСОАВІЯХІМА

«У мінулым у нас не было і не магло быць, бацькаўшчыны... але цяпер, калі мы зверглі капіталізм, а ўлада ў нас рабочая, у нас ёсць бацькаўшчына, і мы будзем адстойваць яе незалежнасць» (Сталін).

Гэта ўказанне правадыра народаў таварыша Сталіна замацавана ў новай Канстытуцыі СССР у словах «Абарона бацькаўшчыны — ёсць свяшчэнны доўг кожнага грамадзяніна СССР».

Асоавіяхім як добраахвотнае абаронае таварыства заклікана выхоўваць адданых сыноў радзімы, совецкіх патрыётаў і без адрыву ад вытворчасці ўзбройваць працоўных і ў першую чаргу членаў сваёй арганізацыі ваеннымі ведамі, каб стаць сапраўдным магутным рэзервам нашай слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Да свайго з'езда асоавіяхім БССР прыходзіць, як арганізацыя палітычна адарваная, мацнеючая і рухаючая ўперад спраўу абароны. Наша таварыства заваявала і елізарную папулярнасць сярод рабочых, калгаснікаў і асабліва прапоўнай моладзі. Любоў працоўных Совецкай Беларусі да Чырвонай Арміі, да нашых слаўных пагранічнікаў і памочніка Чырвонай Арміі — Асоавіяхіма—знайшла сваё яркае адлюстраванне ў практычнай рабоце.

Асоавіяхімаўскія арганізацыі калгасаў «Чырвоная Бярэзіна», «Чырвоная зорка», імя Будзённага, завода імя Варашылава і многіх іншых прадпрыемстваў і калгасаў прышлі да з'езда як перадавыя, як кандыдаты на чырвоную дошку гонару.

Сотні пагранічных первічных арганізацый Асоавіяхіма з'яўляюцца сапраўдным рэзервам пагранічнай аховы і штодзенна дапамагаюць нашым слаўным байцам-пагранічнікам ахоўваць совецкую граніцу.

Рад гарадскіх арганізацый (Менск, Орша, Гомель і інш.) у апошні час шырока разгарнулі сваю работу. Дзесяткі тысяч працоўных ліквідуюць непісьменнасць па супрацьпаветрана-хімічнай абароне. За 1936 год здалі нормы на значок «ППХА» больш 100 тыс. чалавек. Калектывы менскай фабрыкі «Кастрычнік» і завода імя Варашылава па пастаноўцы супрацьпаветранай абароны лічацца ўзорнымі.

Авіяцыя Асоавіяхіма БССР у комсамольскіх асоавіяхімаўскіх спаборніцтвах аэраклубаў у 1936 годзе заваявала адно з першых месц па СССР. На жаль становішча Менскага аэраклуба з'яўляецца найбольш дрэнным у параўнанні з іншымі аэраклубамі. Ён дагэтуль не мае ні будынка, ні свайго аэрадрома, ні ангара для самалётаў.

У барацьбе за значок варашылаўскага стралка ў 1936 годзе прынялі ўдзел дзесяткі тысяч членаў Асоавіяхіма. Здалі нормы 29 тыс. чалавек, замест 14 тыс. чалавек у 1935 годзе. Асабліва станоўчай з'явай трэба лічыць паспяховы пераход на падрыхтоўку варашылаўскіх стралкоў другой ступені, кулямётчыкаў і снайпераў. Стралковыя спаборніцтвы як камандныя, так і індывідуальныя за апошні год выявілі рад майстроў стралковай справы і маладых рэкардсменаў (Драгун, Пешэвіч і інш.). У 1936 годзе створан беларускі кавалерыйскі клуб са школай падрыхтоўкі кадраў, што значна ажывіла работу па коннаму спорту і палепшыла становішча конскага пагалоўя. У 158 гуртках калгасных первічных арганізацый навучаюцца звыш 3 тысяч варашылаўскіх коннікаў.

Асабліва важным з'яўленнем стварэнне беларускага планернага клуба. Павялічылася матэрыяльная база таварыства — ёсць самалёты, планеры, аўтамашыны, вінтоўкі, кулямёты, гарматы, абмундіраванне і інш., павялічылася колькасць аэрадромаў, ангараў, школ і т. д.

Але нам неабходна яшчэ многа працаваць для таго, каб ператварыць кожнае прадпрыемства, кожную МТС, калгас, соўгас і жакт у крэпасць абароны.

Асоавіяхім БССР мае яшчэ і вельмі буйныя недахопы і зрывы ў пастаноўцы масавай абаронай работы. Галоўны недахоп — пякучасць кадраў старшынь райсоветаў Асоавіяхіма і первічных арганізацый. Выключна дрэнна працуюць развізійныя камісіі, у выніку чаго маюць месца факты, калі жулікі прысвойваюць грамадскія грошы. Слаба выкарыстоўваецца грамадскі актыў. Як правіла ў раённых цэнтрах няма сваіх памяшканняў для ваенных клубаў.

Перад Асоавіяхімам стаіць задача — змагацца за арганізацыйнае ўмацаванне таварыства, за ўзнятае якасці ўсёй яго ваенна-масавай работы. Пад кіраўніцтвам партыі і пры дапамозе комсамола Асоавіяхім БССР выканае свой ганаровы абавязак па падрыхтоўцы высокаякасных разведвук для нашай любімай, магутнай, непераможнай Чырвонай Арміі.

Старшыня ЦС Асоавіяхіма БССР МІЛОНАЎ.

СЕННЯ АДКРЫЦЦЁ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА АСОАВІЯХІМА

Сёння ў будынку Белдзяржтэатра адкрываецца III Усебеларускі з'езд Асоавіяхіма. З'езд заслухае справаздачныя даклады прадстаўніка Цэнтральнага совета Асоавіяхіма СССР тав. Уварава аб рабоце Цэнтральнага совета і старшыні ЦС Асоавіяхіма БССР тав. Мілонава аб рабоце беларускай арганізацыі. На гэтым-жа з'ездзе будуць абраны Цэнтральны совет Асоавіяхіма БССР, рэвізійная камісія, а таксама дэлегаты на Ўсесаюзны з'езд Асоавіяхіма.

У рабоце з'езда прымуць удзел 400 дэлегатаў, абраных на гарадскіх і раённых канферэнцыях і 400 гасцей ад партыйных і совецкіх арганізацый фабрык і заводаў, калгасаў, навучальных устаноў. З'езд працягнецца 3—4 дні. У фойе тэатра арганізуецца выстаўка дыяграм і фотаграфій, якія аллюструюць дасягненні Асоавіяхіма. З 6 сакавіка з'езд будзе працаваць у Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАЗЫКІ ЎЗБАГАЧАЮЦЬ РАДЗІМУ

Пачынаючы з 1924 года, я штогодна ахвотна падпісваюся на кожную пазыку, якую выпускала наша дзяржава. На сённяшні дзень я маю аблігацый дзяржаўных пазык на суму 2.500 руб.

У 1929 годзе мне выпаў першы выйгрыш па ўнутранай пазыцы ў суме 300 руб. Гэта яшчэ больш заахвоціла мяне прымаць актыўнейшы ўдзел у падпісцы на пазыку. У 1932 годзе таксама на дзяржаўную ўнутраную пазыку я выйграў 6 тысяч 250 руб. Астатнія гады я ўвесь час меў выйгрышы. Па тыражах розных пазык я выйграў 7.800 рублёў.

Частку выйграных сродкаў я пусціў на палепшэнне свайго дабрабыту. Набыў добрую мэблю, абсталяваў кватэру, набыў сабе і сваім дзецям вопратку, а частку выйгрышу заўсёды скарыстоўваў на пакупку новых аблігацый.

Я пераканаўся ў тым, што пазыкі, якія выпускае наша дзяржава, ідуць выключна на палепшэнне дабрабыту ўсіх працоўных, на ўзбагачэнне нашай радзімы, і таму я ахвотна заўсёды падпісваюся на пазыку.

Надалей я буду ўсе свае аблігацыі я абменяў на аблігацыі пазыкі 2-й пяцігодкі (выпуск 4-га года) і чакаю тыражу, які адбудзецца 25 мая. Я ведаю, што пазычаючы грошы сваёй дзяржаве, я дапамагаю палепшыць наша жыццё.

Буду і ў далейшым актыўна дапамагаць фінансавым органам у рэалізацыі дзяржаўных пазык.

Янаў Грыгор'евіч ШКЛЯР.
пенсіянер г. Бабруйска.

Творчасць Юрыя Майсеевіча Пэна

Швея.

АБУРАЮЧАЕ САМАВОЛЬСТВА

(Пісьмо студэнтаў)

У пастанове партыі і ўрада аб вышэйшай школе было запісана, што студэнты апошняга курса павінны мець у нядзелю два вольныя дні для самастойнай работы. Дырэкцыя Юрыдычнага інстытута БССР (Менск) груба парушыла гэты закон. Яна самавольна выкрэсліла з раскладу гэтыя дні і загрузіла іх аказамічнымі лекцыямі.

Апрача таго, навучальная частка зрабіла такі расклад лекцый, што студэнтам прыходзілася быць у інстытуце з ранку да позняга вечара. А калі ўлічыць шматлікія сходы і паседжанні, то для самастойнай работы студэнтаў нічога не аставалася.

Мы лічым, што такія дзеянні нашай дырэкцыі ідуць у разрэз з пастановай партыі і ўрада. На сваіх сходах мы шмат гаварылі аб гэтым, але ўсё дарэмна. Нашы сігналы аставіся непрымечанымі ні партыйным камітэтам, ні Наркамюстам БССР.

Просім рэдакцыю «Звязды» зацікавіцца гэтай справай.

Група студэнтаў (6 подпісаў)

***

У Юрыдычным інстытуце на працягу першай паловы навучальнага года сапраўды мела месца грубае парушэнне пастановы партыі і ўрада аб вышэйшай школе.

Справа адбылася такім чынам. Выкладчыкам Чарвакову і Гольблату патрабавалася закончыць свой курс да канца 1936 года. Дырэктар інстытута Баднёў і загадчык навучальнай часткі Гофман рашылі задаволіць іх просьбу, але замест таго, каб зрабіць адпаведную расстаноўку лекцый другіх выкладчыкаў, яны ліквідавалі дні самастойнай работы.

Няправільная пабудова вучобы адмоўна адбілася і адбіваецца зараз на паспяховасці студэнтаў. Яны аказаліся загружанымі і не мелі часу працаваць над сабой. Ліквідаваныя дні ў першым паўгоддзі аддаюцца студэнтам у другім паўгоддзі. Акадэмічныя заняткі зараз адсутнічаюць, а самастойная работа не арганізавана. Для гэтага ў інстытуце няма спецыяльных аўдыторый і габінетаў. Бібліятэка адкрыта толькі ў строга вызначаныя часы. Незадаволеныя студэнты ходзяць па карыдорах інстытута, дарэмна трацяць дарагі час.

Тав. Канаплін, якому Наркамюст БССР даручыў праверыць факты парушэння пастановы партыі і ўрада аб вышэйшай школе, фармальна аднёсся да свайго даручэння і не ўнікнуў у сутнасць справы. Ён склікаў сход студэнтаў 4 курса, на які запрасіў т. Гофмана. Перад тварам загадчыка навучальнай часткі студэнты не дагаварвалі сваіх думак. Затое тав. Канаплін пад рэплікі адабрэння Гофмана ўпэўніў студэнтаў, што ніякага парушэння тут няма. А калі парушана, дадае тав. Канаплін, дык толькі норма закона, а не сам закон.

Такі падзел закона — шкодны. Наш сталінскі совецкі закон — цэльны. Парушэнне асобнай нормы ёсць парушэнне ўсяго закона.

Апошняя заліковая сесія прайшла з рук вон дрэнна. Не было адказнасці за сваю работу як з боку выкладчыкаў, так і самой дырэкцыі. Дырэкцыя, напрыклад, перадаручыла прыём экзаменаў па судовай псіхіятрыі другому выкладчыку Плавінскаму, які вёў практычны курс гэтай дысцыпліны. Не ведаючы тэарэтычнага курса, т. Плавінскі паспабіў патрабаванні і вывеў па курсу 96 проц. выдатнікаў.

У пастанове партыі і ўрада сказана, што адзіным крытэрыем паспяховасці студэнта павінны быць экзамены па лекцыйных курсах і залікі па практычных занятках. Гэты прынцып у Юрыдычным інстытуце таксама парушан. Адзнакі паспяховасці тут выстаўляліся не па аднаму на экзамене, а па «добрай волі» выкладчыка. Так, дацэнт Хейфец без усякай пераздачы перарабіў адзнакі са «здавальняюча» на «выдатна» такім студэнтам, як Кацнельсон, Мядаведзеву, Окуню, Лупэвічу, Гельфану і інш. Другі выкладчык Шчэглоў такім самым шляхам перарабіў адзнакі на «выдатна» васьмі студэнтам.

Заліковыя кніжкі фармальна лічацца на руках студэнтаў. Але што з гэтага, калі на працягу трох год там няма ні адной адзнакі аб здачы экзаменаў, і ні аднаго подпісу выкладчыка аб прыёме іх. І калі ў гэтым годзе праф. Чэрвакоў зусім правільна патрабаваў ад студэнткі Вінаградавай заліковую кніжку, яна абазвала яго бюракратам і старарэжымцам. Гэты абураючы факт не знайшоў свайго асуджэння ні ў дырэкцыі, ні ў партыйным і комсамольскім камітэтах, хаця аб гэтым ведае ўвесь інстытут.

Дырэкцыя, партыйны камітэт і ўвесь калектыў Юрыдычнага інстытута павінны самакрытычна асудзіць і па-большэвіцку выправіць дапушчаныя грубыя парушэнні совецкага закона. Будучыя юрысты, захоўвацелі рэвалюцыйнай законнасці павінны не толькі ведаць совецкі закон, але і акуратна выконваць яго.

Урокі Юрыдычнага інстытута павінны ўлічыць ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі. Пастанова партыі і ўрада аб вышэйшай школе ёсць непарушны закон, які абавязаны дакладна выконваць усе вышэйшыя навучальныя ўстановы

Д. ЕРМАКОЎ.

АГЛЯД ДРУКУ

ЗБОРНІК ПАСТАНОЎ

Зусім зразумела, што кожная газета павінна аператыўна і дзейсна даводзіць да мас пастановы і дырэктывы нашых партыйных і совецкіх арганізацый, умець мабілізаваць масы на выкананне гэтых дырэктыў. Аднак, адсюль зусім не следуе, што газета павінна змяшчаць усе пастановы райкома і райвыканкома. Многія рэдактары, відавочна, не разумеюць гэтага, і не толькі не змагаюцца супроць спроб некаторых раённых бюракратаў ператварыць газету ў зборнік пастаноў, але з замалальненнем хапаюцца за іх, стараючыся дагадзіць начальству, набраўшы вялікімі літарамі подпісы сакратэра РК КП(б)Б і старшыні РВК. У чытача, атрымаўшага такую газету, зусім правільна ўзнікае пытанне: «Газета гэта, ці зборнік пастаноў»? Прыкладаў такіх «зборнікаў пастаноў» сярод раённых газет больш чым дастаткова.

У раённай газеце **«Маяк комуны»** (орган **Быхаўскага** РК КП(б)Б і РВК, адказны рэдактар т. **І. Рудзіман**) за 30 снежня 1936 г. уся другая старонка запоўнена пастановамі райвыканкома. На трэцяй старонцы — працяг гэтай пастановы. Глядзім чацвертую старонку гэтайжа газеты і там... яшчэ дзве пастановы раённых арганізацый. Адна з іх —пастанова РК КП(б)Б і РВК «Аб ходзе выканання фінансавага плана 4 квартала». Амаль слова ў слова паўтарае пастанову РВК па гэтаму-ж пытанню дакладна з такой-жа назвай, надрукаваную ўсяго два тыдні перад гэтым. А яшчэ праз тры тыдні—20 студзеня 1937 г.—друкуецца чарговая пастанова РВК па пытаннях фінансавай работы.

За першы тыдзень 1937 г. у трох вышэйшых за гэты час нумарах газеты (за 4, 5 і 7 студзеня) надрукаваны тры пастановы РК КП(б)Б і РВК. 4 студзеня друкуецца пастанова бюро РК КП(б)Б і прэзідыума РВК.

«І. Тэлеграму ЦК КП(б) (Беларусі так і забыліся напісаць) і СНК БССР прынять да **няўхільнага выканання**»(?!) Далей прапануецца стварыць нейкія **«дзяржаўныя** брыгады (выдзелена ў тэксце) для своечасовай... разгрузкі прыбываючых грузаў». Сёмы пункт гэтай-жа пастановы гаворыць: «Абавязаць начальніка станцыі тав. Незнаева акуратна паведамляць клієнтуру аб часе прыбыцця грузаў». Да гэтага начальнік станцыі не ведаў сваіх абавязкаў і каб раённая газета не надрукавала на адзе поўныя калонкі пастанову РК КП(б)Б і РВК, так ён і не ведаў бы, што трэба паведамляць клієнтуру аб атрыманні грузаў!

У такім стылі напісана ўся гэта пастанова, як і амаль усе іншыя раённыя пастановы, друкуемыя ў газеце. Для чаго-ж было займаць старонкі газеты? Такі-ж вузка-дзяляцкі характар носяць і пастановы «Аб плане загатовак скурсыравіны», «Аб перапісу жывёлы», «Аб вярбоўцы рабочай сілы» і інш., якія друкавала газета за апошні час.

Раённая газета «Маяк комуны» так захапілася друкаваннем пастаноў, што 16 снежня 1936 г. друкуе пастанову РВК «Аб несвоечасовай здачы выручаных грошай ў Дзяржбанк». Каму патрабна была гэта пастанова ў раённай газеце? Хіба нельга было на 2—3 чалавек уздзейнічаць іншым шляхам, прымусіць іх выконваць свае службовыя абавязкі, не трацячы на гэта поўстаронкі газеты?

У «Звязду» паступаюць скаргі ад грамадзян з Быхаўскага раёна на злоўжыванні ў калгасах. Напрыклад, у калгасе імя **Ягоды**, — піша т. **Паўлюкоў** — раскрадаюць калгасную маёмасць, пагнаілі бульбу, збруя і інвентар у безгаспадарчым становішчы. Але аб гэтым газета маўчыць. Маўчыць і аб многіх іншых агіднасцях у калгасах. Многа пішуць нам аб адсутнасці належнага парадку ў школах **(Цвярдоўская НСШ** і інш.), аб абслугоўванні рабочых, аб заціску самакрытыкі, аб слабай пастаноўцы культурнай работы.— але ўсё гэта не цікавіць раённую газету. Яна аб гэтым не піша.

Пастановы раённых арганізацый, паведамленні БЕЛТА, артыкулы, перадрукаваныя з газет, вялікія беспрынцыповыя заметкі аб жыцці раёна — вось усё, што можна знайсці ў раённай газеце «Маяк комуны». Кароткіх цікавых інфармацый з калгасаў, соўгасаў, прадпрыемстваў, устаноў раёна — якраз таго, што больш за ўсё неабходна мець на старонках газеты —у быхаўскай раённай газеце вы не знойдзеце. Натуральна, што такая газета не карыстаецца аўтарытэтам, яе перастаюць чытаць. «Маяк комуны» перастала быць газетай саміх мас, ператварылася проста ў бюлетэнь — зборнік пастаноў раённых арганізацый і як газета страціла свой твар.

Большэвіцкі друк — самая моцная, самая востая зброя партыі і прытупляць яе, хоць-бы і шляхам ператварэння раённай газеты ў зборнік пастаноў райкома партыі і райвыканкома, а інакш як прытупленнем зброі партыі, гэта назваць нельга — зусім не патрабна. Газета павінна быць жывой, цікавай і дзейснай! Іменна такой хочуць бачыць чытачы газету «Маяк комуны».

Аб утварэнні цэнтральнай, акруговых, гарадскіх і раённых камісій па барацьбе з паводкай і лёдаходам

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Для правядзення падрыхтоўчых мерапрыемстваў і арганізацыі барацьбы з паводкай і лёдаходам Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Утварыць Цэнтральную Камісію па барацьбе з паводкай і лёдаходам у складзе начальніка Галоўміліцыі НК Унутраных спраў БССР т. Клачкова (старшыня), НК Комунальнай гаспадаркі БССР—тав. Васэрмана і начальніка Ушасдора НК Унутраных спраў БССР тав. Серыкава.

2. Абавязаць АВК, горсоветы і РВК у двухзённы тэрмін утварыць адпаведныя акруговыя, гарадскія і раённыя камісіі па барацьбе з паводкай і лёдаходам.

3. Пастановы і распараджэнні цэнтральнай, акруговых, гарадскіх і раённых камісій па барацьбе з паводкай і лёдаходам з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх арганізацый і насельніцтва.

Намеснік старшыні Совета Народных Камісараў БССР А. ЛЮБОВІЧ.

Кіраўнік спраў Совета Народных Камісараў БССР І. ЛУК'ЯНЧЫК.

ФАРСІРАВАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НОВАГА СЕЗОНА

БАБРУЙСК. Практыка падрыхтоўкі бабруйскіх цегелень да новага сезона паказвае, што кіраўнікі гэтых заводаў зусім не ўлічылі ўрокі 1936 года. Асабліва пагражаючае становішча на заводзе № 12. Гэта цагельня сёлета рэканструіруецца. Яе вытворчая праграма павялічваецца ў два разы, да выпуску 10 мільёнаў цаглін за год. Завод пачынае працаваць на новых масівах сыравіны. Гэта патрабуе ад кіраўнікоў (дырэктар Леонаў, тэхнарук Балтарчук) асаблівай гнуткасці і апаратыўнасці. Але-ж яе няма.

Пачаць хоць-бы з сыравінай базы. Беларускім навукова-даследчым інстытутам прамысловасці праведзены толькі пошукавыя доследы гэтай базы. Скважыны зроблены на адлегласці 200 метраў адна ад другой (на плошчы 45 га зроблена толькі 27 скважын). Між тым неабходна яшчэ зрабіць прамысловае даследаванне, тым больш, што па заяве тэхніка-кераміка тав. Герасіміовіча (прымацаванага да завода), даныя буравога журнала кажуць, што залягание гліны тут нясталае.

Не лепш абстаіць справы і з сушыльнай плошчай. Тэхнарук завода тав. Балтарчук маркуе перавесці з закансерваванай цагельні № 13 5 сушыльных сараяў. Разам з наяўнай сушыльнай плошчай гэта забяспечыць прасушку 6 мільёнаў цаглін. А дзе-ж будуць сушыць астатнюю цаглу? Аб гэтым на заводзе не клапоцяцца. Між іншым цагельня ўжо мела ўрок у 1936 годзе, калі з-за недахопу сушылак 700 тысяч цаглін перайшло ў брак.

Вузкім месцам з'яўлялася таксама ў мінулым годзе 16-камерная печ. Сёлета пры падвоенай праграме пяжкасці несумненна павялічацца. Зусім незразумела, чаму кіраўніцтва завода рашыла абмяжавацца толькі рамонтам печы і ўстаноўкай дымасосу, у той час, калі яна патрабуе неадкладнай рэканструкцыі.

Не прыступілі яшчэ да падрыхтоўкі і абсталявання інтэрнатаў. На заводзе ёсць толькі адзіны інтэрнат, разлічаны максімальна на 50 рабочых, а патрэбна размясціць 250 чалавек.

Нядаўна закупілі вузкакалейку з матавозам, але-ж зусім марудна ідзе падрыхтоўка да яе ўстанаўлення. Няма яшчэ шпал, слупоў і дроту для асвятлення кар'ера.

Такое-ж становішча і на Бабруйскім чарапічным заводзе № 2. Дырэктар завода тав. Абражэвіч і тэхнарук Чайко цалкам перадаверылі ўсю падрыхтоўчую работу механіку Верцынціну, які цалую зіму нічога не рабіў, і ніхто яго нават не правяраў. Толькі 27 лютага гэты механік здаў машынабудаўнічаму заводу імя Сталіна дадатковы заказ на частку верхняга вальцовачнага варштата, які па плану павінен быць ужо адрамантаван.

Абодвы заводы не забяспечаны апалам. З 7 тысяч тон торфу па плану, завод № 12 вывез толькі 1200 тон, чарапічны завод з тысячы тон вывез 50 тон.

Крыху лепш падрыхтаваўся да сезона завод № 11 (дырэктар Эпштэйн), але і тут ёсць рад недаробак. Марудна ідзе заканчэнне жыллёвага дома на 180 рабочых. Цагельні неабходна яшчэ скончыць механізацыю падачы сыравіны ў печку на ўчастку № 1, падрыхтаваць матэрыял для штучнага ацяплення сушыльных сараяў на выпадак марозаў і інш.

Да пачатку сезона 1937 года на цагельных заводах асталіся лічаныя дні. Кіраўнікі цагелень і трэста № 1 павінны скарыстаць астаўшыйся час для хутчэйшай падрыхтоўкі, каб новы сезон пачаць па-стаханаўску.

А. БЕРАЗІНСКІ.

НЕПАЧУТЫЯ СІГНАЛЫ

Мы вельмі многа дасылалі пісем у рэдакцыю газеты **«Калгасная звязда»** (Хоцімскі раён), і большасць іх загінула невядома дзе. Некаторыя нашы пісьмы рэдакцыя высылала на расследаванне раённым арганізацыям і ў сельсоветы, але выніку з расследваннямі не атрымалася ніякіх. Так асталіся непачутымі нашы сігналы аб злоўжываннях у краме, аб срыве ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці па Бяседавіцкаму сельсовету і многа іншых

КУРДЫЧКА, ДРАЗДОЎ.

А. ЛАЎРЭЦКІ.

Нікалай Васільевіч Гогаль

(Да 85-годдзя з дня яго смерці)

Н. В. Гогаль адзін з тых геніяльных пісьменнікаў, якія прышлі на змену заўчасна загінуўшаму найвялікшаму рускаму паэту А. С. Пушкіну. Пушкін адкрыў шырокую дарогу Гогалю, як і іншым вялікім пісьменнікам. Белінскі ў свой час указваў, што Пушкін першы вывеў у «Яўгеніі Онегіне» людзей звычайных, не як выключэнні з агульнага правіла, а як з'явы, тыповыя для тагочаснага грамадства. Гогаль з выключнай паслядоўнасцю прадаўжаў гэту лінію пушкінскага рэалізма. Паказаўшы, як грамадскія адносіны адбіваюцца ў лёсе маленькіх людзей, Гогаль падзвычай расшырыў галіну літаратуры, наблізіў яе да жыцця мас.

Вось чаму так вялікае значэнне Гогаля для сваёй эпохі. Гэта быў час злейшай рэакцыі, наступіўшай пасля падзей 14 снежня 1825 года, пасля паражэння «дваранскіх рэвалюцыянераў». Прыгонная права, унутрана ажыўшае сябе, было ўсё-ж дастаткова моцным тормазам развіцця краіны. Усё чэснае і прагрэсіўнае змагалася супроць разлагаўшагася прыгоннага ладу, які адчаянна змагаўся за сваё існаванне. Гогаль узбройваў на барацьбу супроць гэтага ладу. Слова вялікага мастака-рэаліста было магутнай сілай, якая дзейнічала супроць прыгоннічай сістэмы. Яно дыскрэдытавала яе, уплывала перакананне ў яе асуджанасці, прадвяшчала канец прыгонніцтва. Таму Гогаль не мог не выклікаць захапленне адных і азлобленую нянавісць другіх. Вакол Гогаля ўвесь час ішла барацьба. Гогаля з энтузіязмам вітаў і страсна прапагандаваў вялікі рускі крытык — разночынец Белінскі. Гогаля травіла рэакцыйная прэса ў асобе Булгарына і яму падобных. Яго прабавалі «прыручыць» больш дальнебачныя ідэолагі рэакцыі — славянафілы, якім удалося выкарыстаць, асабліва ў апошні перыяд жыцця пісьменніка, яго страх перад рэвалюцыйнымі вывадамі, следаваўшымі з яго-ж уласнай творчасці. Але ўсе гэтыя спробы так альбо інакш «абяшкодзіць» Гогаля асталіся ў канечным выніку бясплоднымі. Мастацкія творы Гогаля дзейнічалі сваёй уласнай сілай, часамі нават незалежна ад волі іх творцы.

Ніхто з рускіх пісьменнікаў не даў столькі тыповых характараў, як Гогаль, адобразаў, якія ўвайшлі ў мову, стаў папулярнымі абазначэннямі найбольш распаўсюджаных з'явішч прыгоннічкай сапраўднасці. У героях «Рэвізора», сюжэт якога, як і «Мертвых душ», быў дан Гогалю вялікім Пушкіным, выкрыт і заклеймён чыноўніцкі свет, дзе панаваў толькі адзін закон — «брась па чыну», усе-ж астатнія законы існавалі толькі для таго, каб абыходзіць іх. Хлестаковы, Ноздрэвы, Манілавы, Сабакевічы, Чычыкавы, Каробачкі, Плюшкіны, — нястрымная хлусня і бесстабашная нагласць адных, звярыная хватка і драпежніцкая абарапістасць другіх, тупое скаідоцтва, альбо шалёная скупасць трэціх,—ужо гэта стварала гнятучае ўражанне «амяртвення душы», выклікаючае пратест супроць забіваючага яе грамадскага ладу. «Мёртвыя душы»—назва найвялікшага твора Гогаля — стала кляймом на ўсёй пікалаеўскай манархіі. Недарма Пушкін, праслухаўшы першыя накіды «Мёртвых душ», усклікнуў: «Як сумна наша Расія». Уражанне гэта дасягалася як велізарнай сілай выразнасці гогалеўскіх вобразаў, велізарным уменнем падкрэсліць іх істотны бок, так і здольнасцю мастака паказаць усе тыя ніці, якія звязваюць гэтыя ўзоры са штолзённай, усім знаёмай сапраўднасцю. Гэта асаблівасць творчасці Гогаля ставіць яго ў адзін рад з найвялікшымі пісьменнікамі сусветнай літаратуры.

Канцэнтруючы ўвагу на той альбо іншай рысе чалавека, Гогаль не забываў ні аб чалавеку ў цэлым, якому гэта рыса належыць, ні аб сапраўднасці, якая ў гэтым чалавеку надала такія размеры той альбо іншай адмоўнай рысе. Вось чаму вобразы Гогаля не ўспрымаліся як тыпы, якія ўказваюць на ўроджаную загану людзей наогул, альбо данага народу. Недарма Герцэн пісаў у сваім «Дзённіку», што «Мёртвыя душы» Гогаля, — дзіўная кніга, — горкі папрок сучаснай Русі, але не безнадзейны. Там, дзе позірк можа пранікнуць скрозь туман нячыстых гнёвых выпарэнняў, там ён бачыць удалую, поўную сілы нацыянальнасць».

Вобразы Гогаля абвінавачвалі не краіну, не народ, а рэжым і яго носьбітаў. Яны сведчылі аб тым, як гэты рэжым скажае чалавечую прыроду і губіць чалавечае жыццё. Гогаль умеў паказаць дзіўназ і страшэннае ў звычайным, у тым, да чаго многія «прызвычаіліся», умеў прымусіць прызадумацца над прычынамі гэтага дзіўнага і страшэннага. Таму творчасць Гогаля стала такой блізкай лепшым людзям эпохі. І нават тады, калі Гогаль выдаў свае «Выбранные места из переписки с друзьями», кнігу, напісаную ў перыяд страшнага духоўнага ўпадку пісьменніка і супярэчыўшую ўсяму сэнсу яго творчасці, сувязь яго з новай Расіяй не аслабела. Белінскі ў пяжкія мінуты працягваў «адчытвацца» «Мертвымі душамі». Чэрнышэўскі не мог не лічыць Гогаля сваім таму, што кожны вобраз, кожнае слова Гогаля-мастака папяўрджалі бязлітаснае адмаўленне старай Расіі. І недарма Ленін гаворыць аб тым, што ідэі Белінскага і Гогаля «рабілі гэтых пісьменнікаў дарагімі Некрасаву — як і ўсякаму прыстойнаму чалавеку на Русі»... (Ленін. Тв. т. XVI, стар. 132).

У працэсе праўдзівага мастацкага ўзнаўлення сапраўднасці стваралася гэтыя ідэі і перамагалася тое, што было ўнаследавана Гогалем ад яго класа, ад акружаючага яго асяродзія: яго забабоны, яго кансерватызм. Справа тут не ў бесвядомасці творчасці, а ў паслядоўнасці рэалізма. Мастак можа таксама свядома твараць свае вобразы, як вучоны рабіць свае вопыты і будаваць свае гіпотэзы, хоць не заўсёды той і другі могуць зрабіць правільныя вывады са сваёй работы і прасачыць яе сувязь з іншымі галінамі жыцця і культуры. Рэалізм-жа па сваёй прыродзе прагрэсіўны, а слядоўны паслядоўны рэалізм і рэвалюцыйны, так як пранікае ў дыялектыку саміх рэчаў. Рэалізм-жа Гогаля быў самым паслядоўным для свайго часу. Ужо самы дэмакратызм, сапраўдная народнасць творчасці Гогаля — народнасць і ў сэнсе нацыянальнай своеасаблівасці, і ў сэнсе чырыні ахопу—усё гэта гаварыла аб аб'ектыўнасці мастацтва Гогаля: «ён нічога не змякчае, не ўпрыгожвае ў выніку... прывычных прыстрасцей», — пісаў Белінскі. Гэта рабіла асабліва дзейнай гогалеўскую тыпізацыю сапраўднасці.

Абмяжоўваючы тыповае звычайным, распаўсюджаным, Гогаль праявіў глыбокую мудрасць свайго рэалізма. Для дэградуючага прыгонніцкага грамадства характары, узнімаючыяся над сярэднім узроўнем, не маглі быць тыповымі, як тыповы яны для класа, якому належыць будучае. Не складаючы большасці ў гэтым класе, яны ўсё-ж тыповы для яго ў тым сэнсе, што з'яўляюцца авангардам масы, моцна звязаны з ёй, што маса ідзе ў адным з імі напрамку і ўвесь час дагоняе іх. Такіх станоўчых герояў літаратура прыгонніцкага грамадства даць не магла. А калі яна прабавала гэта рабіць, яна прыхарошвала сапраўднасць. Як заўважаў яшчэ Чэрнышэўскі, «не столькі па аднабаковасці таленту... колькі іменна па сілі яго таленту, састаяўшай ў незвычайна тонкім радстве з сапраўднасцю... Гогаль ніколі не ўмеў выдумваць»... І ў Гогаля знайшлося дастаткова сіл, каб убачыць хлусню ў сваёй уласнай творчасці — у другім томе «Мёртвых душ», дзе жыццёвая праўда была перакручана, і спаліць кнігу. Тым самым Гогаль яшчэ раз упэўніваў сябе, як стваральніка вялікіх твораў, на шляху якога «Выбранные места...»—толькі эпізод, які гаворыць аб складанасці ўмоў, у якіх пісьменніку прышлося жыць.

Паслядоўнасць, дэмакратызм, дзейсная канкрэтнасць творчасці Гогаля, яго поўны горачы і гневу гуманізм, — вось што дорага нам у вялікім рэалісце, кінуўшым выклік гнуснай «расійскай сапраўднасці» свайго часу.

СКАРМЛІВАЮЦЬ САРТАВОЕ НАСЕННЕ

Па дзяржаўнаму плану веснавой сяўбы ў 1937 годзе Чачэрскі раён павінен засеяць сартавым насеннем зерневых 5.050 гектараў, у тым ліку 920 гектараў яравой пшаніцы, 1.850 гектараў аўса і 2.280 гектараў ячменю; сартавых пасеваў бульбы—710 гектараў.

Як-ж забяспечаны калгасы раёна сартавым насеннем?

Па даных райземаддзела насення аўса хапае толькі на плошчу 640 гектараў, пшаніцы—650 гектараў і ячменю—1272 гектары.

— Больш насення ў нас няма,—заяўляе загадчык райземаддзела тав. Кузмянкоў.

Раённы зямельны аддзел не прыняў патрэбных мер, каб забяспечыць выкананне плана сяўбы сартавым насеннем. Паміж калгасамі неабходна было абмяняць звыш 2 тысяч цэнтнераў аўса сорту «Маскоўскі», абменена-ж усяго 15 цэнтнераў. Замест плана абмену 2600 цэнтнераў ячменю абменена 60 цэнтнераў.

Калгасы імя 1 мая і «Стаханавец», якія мелі сотні цэнтнераў сартавога аўса для абмену, скармілі яго жывёлай. У калгасах Новазарачанскага, Чачэрскага і інш. сельсоветаў сартавая пшаніца размеркавана на працадні, і для насення нічога не пакінута.

Праз базу Заготзярно калгасы маюць магчымасць абмяняць 50 тон таварна-сартавой і 48 тон сартавой пшаніцы і 8 тон аўса. Але дагэтуль ні адзін калгас не прыступіў да абмену.

Не лепшае становішча па абмену насення бульбы. Райземаддзел не ведае, колькі ёсць гэтага насення. Сігналы з калгасаў сведчаць аб тым, што сартавая бульба ў многіх месцах скормлена.

Ніхто не клапоціцца аб захаванні сартавога насення. Авёс, пшаніца, ячмень яшчэ поўнасцю не ачышчаны і не праверены на ўсхожасць. Наогул ачыстка насення ў калгасах праходзіць вельмі марудна. Праз трыер прапушчана толькі 50 проц. зернавых, засыпаных на насенне. 23 трыеры, якія ёсць у раёне, у большасці няспраўныя і стаяць без работы.

А. ЛЯСНЫ.

КАЛІ СКОНЧЫЦЦА РАМОНТ?

Кіраўнікоў Цялушскай МТС зусім не турбуе падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Дырэктар Аўдзеенка адносіцца да гэтай важнай справы абыякава.

Рамонт сельскагаспадарчага інвентару праводзіцца вельмі марудна. Рамонт трактароў таксама не скончан, адрамантавана толькі 75 процантаў трактароў. Затрымка ў рабоце атрымалася таму, што ў майстэрні нехапае рабочай сілы і запасных частак для трактароў. Пра гэта дырэкцыя ўспомніла толькі зараз. Працоўная дысцыпліна вельмі слабая. Рабочыя амаль заўсёды спазняюцца на работу.

Пры такіх тэмпах работы цяжка нават сказаць, калі скончыцца рамонт. Між тым час не церпіць, тэрміны прахо́дзяць.

БУЛЬБА.

ЗРЫВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ТРАКТАРЫСТАЎ

Падрыхтоўка трактарыстаў—важнейшая задача МТС. Якасць іх будучай работы залежыць ад набытых імі зараз ведаў. Але не ўсе кіраўнікі МТС гэта зразумелі. Зусім безадказна падышла да падрыхтоўкі трактарыстаў дырэкцыя Бярэзінскай МТС.

Памяшканне, дзе займаюцца курсанты, брудное і халоднае. Лекцыі часта зрываюцца па віне выкладчыкаў. За выкладанне дырэкцыя МТС не аплачвае, таму выкладчыкі часта прапускаюць лекцыі.

Калі загадчык курсаў запытвае дырэктара МТС аб выплаце за выкладанне, дырэктар Краўчанка адказвае тонам сур'ёзнага чалавека: «Ідзіце вучыце і не дурыце мне пра грошы».

В-ы.

На фабрыках і заводах, у калгасах і соўгасах рэспублікі разгорнута вывучэнне Канстытуцыі Совецкай Беларусі. НА ЗДЫМКУ: калгаснікі калгаса імя Калініна Пухавіцкага раёна за чыткай Канстытуцыі БССР. Фото Я. Салавейчыка.

ВЫСОКАЙ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЮ У РАБОЦЕ АДЗНАЧАЮЦЬ НОВУЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

На прадпрыемствах і ў калгасах Бабруйшчыны праходзіць глыбокае ўсебаковае вывучэнне Канстытуцыі СССР і БССР.

Вывучэнне новых Канстытуцый суправаджаецца вялікім вытворчым уздымам. На машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна стаханаўцы, спаборнічаючы паміж сабой, даюць новыя стаханаўскія рэкорды. Слёсары Гіргіз і Князік 27 лютага выканалі сваю дзённую норму на 410 проц. кожны, капельшчык Прышчэпчык — на 386 проц., стаханавец Сірыцын — на 373 проц., брыгада капельшчыкаў Валько — на 314 проц., брыгада токараў па металу Бузак — на 237 проц.

На фанерным заводзе імя Кірава асноўны лушчыльны цэх 26 лютага выканаў свой план на 117,4 проц. Наперадзе ідзе брыгада лушчыльшчыка — дэлегата Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў т. Цэйтліна, якая ў апошнія дні выконвае тэхнічную норму на 125—130 проц. Уцільны цэх завода выконвае план на 122,5 проц.

Натхнёныя новай Канстытуцыяй, калгаснікі сельгасарцелі імя Егорава, Міхалеўскага сельсавета, разгарнулі вялікую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Калгас ужо адрамантаваў інвентар, поўнасцю вывез мінеральнае ўгнаенне і 500 тон гною.

Калгаснікі сельгасарцелі «Чырвонагвардзеец», Туркаўскага сельсавета, Галубіцкі і Казлоў адзначаюць Канстытуцыю штодзённым выкананнем норм па вывазцы торфу на ўгнаенне на 150 проц.

В. АСТРОЎСКІ.
А. ГОЎХМАН.

НОВЫ ВЫТВОРЧЫ ЎЗДЫМ

КАРМА. У калгасах раёна глыбока вывучаюць матэрыялы Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў. На новую Канстытуцыю БССР калгаснікі адказваюць узмоцненай большэвіцкай падрыхтоўкай да веснавой сяўбы.

Па-большэвіцку падрыхтаваўся да сяўбы калгас імя Куйбышэва. Сельскагаспадарчы інвентар адрамантаван поўнасцю, збруя знаходзіцца ў добрым выглядзе і падагнана пад кожнага каня. Усе коні калгаса знаходзяцца ў добрай упітанасці.

60-гадовыя калгаснікі Ганжуроў і Шмелянкоў на новую Канстытуцыю БССР адказалі перавыкананнем норм вытрацоўкі на 250 проц.

Брыгадзір жаночай трактарнай брыгады — стаханаўка Варвара Ушава ў часе вывучэння матэрыялаў Надзвычайнага Усебеларускага З'езда Советаў заявіла:

— Новая Канстытуцыя БССР, як пражэктар, асвятляе ўсе нашы заваяванні, наша шчаслівае, радаснае жыццё. Канстытуцыя натхняе нас на лепшую працу. У гэтым годзе я буду працаваць з патроенай энергіяй. Дам 1.500 гектараў на трактар.

Сотні калгаснікаў раёна новым вытворчым уздымам адказваюць на зацверджаную З'ездам Советаў Канстытуцыю БССР.

І. КАВАЛЁЎ.

ТЭАРЭТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Для падвядзення вынікаў вывучання Сталінскай Канстытуцыі комсамольскі камітэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта правёў тэарэтычную канферэнцыю ўсіх слухачоў комсамольскіх палітшкол. У БДУ працавала 17 палітшкол комсамольцаў, якія былі ўкамплектаваны па развіццю слухачоў. Тэарэтычная канферэнцыя таксама праводзілася трыма групамі, у залежнасці ад развіцця і падрыхтоўкі слухачоў.

Аб канферэнцыі ўсе студэнты вдалі за паўтара месяца і рыхтаваліся да яе. Для дакладчыкаў (28 чалавек) было дана 3 кансультацыі высокакваліфікаванымі кансультантамі—выкладчыкамі грамадскіх дысцыплін, дацэнтамі-комуністамі тт. **Сыцько, Чымбург, Валчок.**

Дакладчыкі **Еленсон, Ганчароў, Ожунь** і інш. зрабілі даволі глыбокія і змястоўныя даклады. У спрэчках выказалася 42 чалавекі.

Больш 400 комсамольцаў прымалі ўдзел у тэарэтычнай канферэнцыі. Адначасова праводзілася і канферэнцыя профсаюзных палітшкол, якімі ахоплена каля 400 чалавек. У бліжэйшы час будзе праведзена тэарэтычная канферэнцыя партыйных школ.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

У ГОНАР КАНСТЫТУЦЫІ БССР

Ва ўсіх цэхах менскай кандытарскай фабрыкі «Комунарка» адбыліся сходы, прысвечаныя зацверджанню Надзвычайным XII Усебеларускім З'ездам Советаў Канстытуцыі ордэнаноснай БССР. З'езд выканаў волю народу, аднагалосна і аднадушна зацвердзіў Канстытуцыю квітнеючай Совецкай Беларусі, якая пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага Сталіна ідзе ад перамогі да перамогі — гаварылі рабочыя і работніцы ў сваіх выступленнях.

Натхнёныя Канстытуцыяй БССР, стаханаўцы фабрыкі паказваюць узоры барацьбы за высокую прадукцыйнасць працы і паляпшэнне якасці прадукцыі, даюць новыя вытворчыя рэкорды.

26 лютага стаханавец карамельнага цэха Яўген Баран за змену выпрацаваў на вакуум-апараце 5.053 кілаграмы цукеркавай масы, замест нормы 2.700. Тав. Баран уступіў у соцыялістычнае спаборніцтва са стаханаўцам Трушкевічам. Абодва ўзялі абавязацельствы яшчэ больш павысіць прадукцыйнасць і якасць працы.

Стаханаўская брыгада тав. Ганчарык гэтага-ж цэха выконвае вытворчы план у апошнія дні на 260 проц., брыгада Верабейчыка — на 274 проц., брыгада Левіна — на 218 проц.

Значным перавыкананнем норм адзначаюць новую Канстытуцыю і работніцы дражжайнага цэха Елена Рыбалт і Маня Расолька. Першая выконвае норму на 217 проц., другая на 212. Гэтыя работніцы зусім нядаўна выконвалі норму ў сярэднім на 120—150 проц.

Рабочы калектыў фабрыкі ўзяў рад абавязацельстваў: глыбока і ўсебакова вывучыць Канстытуцыю СССР і БССР, сістэматычна выконваць і перавыконваць месячныя і квартальныя планы з тым, каб да 1 снежня 1937 года закончыць гадавую праграму; асвоіць завёртачныя машыны; дабіцца сярэдняга перавыканання новых норм на 25 проц. і інш.

В. ВАСІЛЬЕЎ.

У ТАЛАЧЫНЕ ПАКРЫВАЮЦЬ ВОРАГАЎ НАРОДУ

У канцы студзеня гэтага года ў лугавым соўгасе «Усвіж-Бук», Саколінскага сельсавета, Талачынскага раёна, адбыўся абураючы факт. Увечары ў соўгасным клубе ў прысутнасці тэхнарука Гофа, старшага бухгалтара Раткевіча і некаторых рабочых, старшыня рабачкома—комсамолец Варашнёў нанёс трактарысту Шараю Аляксею нажом 4 раны ў грудзі і твар. Адначасова Варашнёў нанёс дзве раны ў руку і жонцы Шарая, якая выступіла ў абарону свайго мужа.

Дырэкцыя соўгаса і асобныя кіраўнікі раёна спрабуюць расцаніць гэта, як просты хуліганскі ўчынак з боку старшыні рабачкома Варашнёва. Старшыня райвыканкома Конікаў прама заяўляе, што нічога, моў, тут асаблівага няма, што гэта з'яўляецца простай бойкай і таму няма чаго займацца гэтай справай усім раённым арганізацыям.

Ці так гэта? Не, далёка не так. Учынак старшыні рабачкома Варашнёва ні ў якім разе нельга лічыць простым хуліганствам. Трэба прама сказаць, што гэты паступак Варашнёва з'яўляецца адным з метадаў барацьбы класавага ворага, які імкнецца разваліць соўгас.

Справа ў тым, што трактарыст Шарай Аляксей лічыцца ў соўгасе, як гаворыць сам дырэктар Крупец, неспакойным чалавекам. У соўгасе зусім прылушана самакрытыка. Ніхто з рабочых не асмельваецца сказаць аб тых агіднасцях і злачынствах, якія творацца ў гаспадарцы. Толькі адзін Шарай адкрыта выступае і гаворыць аб гэтым, указваючы канкрэтных вінаўных у безгаспадарчасці і злачынствах. Апрача таго Аляксей Шарай, не хаваючыся за псеўдонімам, піша аб гэтым у раённую газету «Калгаснік Талачыншчыны». Шарай з'яўляецца актыўнейшым селькорам раённай газеты, часамі піша і ў «Звязду».

Пісаць-жа пра соўгас «Усвіж-Бук» ёсць што. У соўгасе пануе надзвычайная безгаспадарчасць, расцягваецца, знішчаецца ўсенароднае дабро. Дырэктар соўгаса—комуніст Крупец, які быў знят у 1933 годзе з пасады дырэктара гэтага-ж соўгаса за безгаспадарчасць, у 1935 годзе зноў нейкім чынам трапляе сюды дырэктарам, і зноў вядзе соўгас да развалу. Ён падабраў сабе такіх людзей, як бухгалтара Раткевіча, які не ведае добра рахунковай справы, але затое добра ўмее аблічваць рабочых; кладаўшчыка Сумнага, які абважвае рабочых. Па настаянню Крупеца, як парторга тэрытарыяльнай первічнай партарганізацыі, быў абран старшынёй рабачкома Варашнёў. Апрача гэтага Крупец прымае заўсёды на сезонныя работы былых кулакоў з навакольных вёсак, якіх ставіць у лепшыя ўмовы, чым пастаянных рабочых соўгаса.

З гэтай групай людзей Крупец заўсёды п'янствуе, разбазарвае соўгаснае дабро. Нямала ўплывае напрыклад, соўгаснага сена на базар, а грошы за яго ідуць дырэктару і яго падхалімам і сабутэльнікам.

Няма ніякага догляду за жывёлай. У выніку гэтага соўгас мае велізарнейшыя страты па жывёле. Амаль кожны дзень дохнэ па 2—3 парасяты ў двух-трохмесячным узросце. У пачатку кастрычніка мінулага года быў такі выпадак: увечары не прышло з поля 11 самых лепшых соўгасных кароў. Аб гэтым зараз-жа далажылі дырэктару, але ён не патурбаваўся паслаць людзей адшукаць кароў. На другі дзень рабочыя выпадкова знайшлі ўсіх гэтых 11 кароў у дрыгвяной канаве. Каровы былі ўвагнаны кімсьці ў канаву і 9 з іх за ноч залілося, а дзве ледзь былі жывыя.

Пасля доўгага следства, аб гэтых каровах адбыўся ў Талачыне суд. І характэрна, што да адказнасці чамусьці быў прыцягнут адзін толькі тэхнарук Гоф, якому суд даў адзін год прымусовых работ з адлічэннем 15 проц. у карысць дзяржавы. Дырэктар-жа, загадчык скотнага двара і пастух выступалі ў судзе ў якасці сведак.

Зусім зразумела, што такое рашэнне суда ні для каго из паслужыла ўрокам. У соўгасе па-ранейшаму адносяцца да жывёлы па-драпежніцку, па-шкодніцку. 15 валоў стаяць пад адкрытым небам у снезе ў зрубе без страхі. У студзені гэтага года 15 жарабят вышлі з канюшні і, шукаючы вады, забрылі ў балота за 4 кіламетры ад соўгаса і там начавалі.

Аб усім гэтым трактарыст Шарай Аляксей не раз пісаў у раённую газету. Рэдакцыя пасылала допісы на расследванне, выязджалі часам з райвыканкома і з райкома для праверкі фактаў. Аднак ніякія меры не прымаліся для паляпшэння работы ў соўгасе. А тым часам, у дырэктара Крупеца ўсё больш і больш расла помста па «неспакойнага» трактарыста Шарая Аляксея. Помсціў Шараю і старшыня рабачкома Варашнёў. І як вынік гэтай помсты — напад Варашнёва з нажом на трактарыста, на актывіста соўгаса.

Трэба быць палітычным слепцом, каб не заўважыць у гэтым агіднейшым факце брудную справу класавага ворага. Варашнёў знят з работы, але, знаходзячыся на волі, пагражае зараз трактарысту Шараю смерцю.

Трэба сказаць, што і раённая газета не дапаніла палітычна гэтага факта. Яна глуха аднеслася да сігналаў свайго актыўнага селькора. Калі Шарай звярнуўся ў рэдакцыю газеты за дапамогай, яму толькі параілі: «Падавай скаргу ў нарсуд».

Ні райком партыі, ні райвыканком да гэтага часу па-сур'ёзнаму не займаліся чаму ў соўгасе «Усвіж-Бук» расцягваецца направа і налева народнае дабро чаму знішчаецца жывёла. Няма ў кіраўнікоў раёна трывогі аб соўгасе і пасля нападу на трактарыста Шарая Аляксея.

Раённыя арганізацыі мелі ўжо сур'ёзнейшыя сігналы аб грубейшым парушэнні рэвалюцыйнай законнасці і Сталінскай Канстытуцыі, аб чым пісала «Звязда» яшчэ ў снежні мінулага года. Зусім нядаўна «Звязда» пісала аб тым, што райком партыі, захапляючыся гаспадарчымі пытаннямі, забывае пра партыйную работу і што рад школ і ўстаноў раёна засмечаны класава-варожымі элементамі.

Гэтыя сур'ёзнейшыя сігналы не паслужылі ўрокам для раённага кіраўніцтва. Усё яшчэ пануе тут дабрадушнасць і дробнабуржуазная расслябанасць у рабоце. Ці не пара комуністам Талачынскага раёна пераглядзець дзейнасць свайго райкома?

С. СЯМАШКА.

УРОКІ ДРЫСЫ

Паўтара года Дрысенскай партыйнай арганізацыяй «кіраваў» ад'ялдзны ворог партыі і рабочага класа — Кацельнікаў. Гэты нягоднік здолеў да апошніх дзён утоіць сваю актыўную барацьбу супроць партыі і совецкай улады ў радах эсэраў. Толькі нядаўна маска з гэтага прайдзісвета сарвана. Цэнтральным Камітэтам партыі ён знят з работы і выключан з партыі.

І вось на раённым партыйным сходзе, дзе абмяркоўвалася гэта пытанне, выступілі члены бюро райкома — культпроп Капюшэнка, старшыня РВК Гуцаў, Шапіра і інш. Яны прызнавалі свае памылкі, гаварылі, што праглядзелі, не раскусілі, не ўлічылі ўрокі працэсаў, і іншыя завучаныя трафарэтныя словы.

Але з выступленняў радавых комуністаў высветлілася, што гэтыя члены бюро, і былы член бюро — другі сакратар райкома Фрыдзон (зараз сакратар Расонскага райкома) не толькі праглядзелі і не раскусілі Кацельнікава — яны вельмі многае ведалі, яны ведалі, праўда, не мінулую «дзейнасць» гэтага ворага, — затое вельмі цяперашнія яго антысовецкія, антыпартыйныя паводзіны, ведалі і замаўчалі, нікому аб гэтым не сігналізавалі. І гэта не дзіва таму, што ў бюро існавала сямейнасць і кругавая парука.

Культпроп райкома Капюшэнка расказаў на раённым сходзе аб неаднаразовых выпадках Кацельнікава супроць вывучэння гісторыі партыі. Аб гэтай наглай вылазцы Капюшэнка нікому не сігналізаваў. Ды і на гэтым партыйным сходзе Капюшэнка паўрад ці расказаў-бы аб ім, калі-б да яго не расказаў па гэтым сходзе сакратар райкома комсамола Крылоў.

Гэта не алзінкавы факт наглай вылазкі Кацельнікава супроць вывучання гісторыі і палітыкі нашай партыі, якая яму была чужда. На адным сходзе настаўнікаў, дзе Кацельнікаў рабіў даклад, настаўнікі прасілі яго прымацаваць да іх падрыхтаваных комуністаў для вядзення палітмасавай работы. Кацельнікаў адказаў: «Вывучайце мастацкую літаратуру, і для вас будзе ўсё зразумела». Тады выступіў адзін беспартыйны настаўнік і заявіў: «Выбачайце ўжо, таварыш сакратар,—адна справа мастацкая літаратура, другая справа — палітычная літаратура». Аб гэтым факце таксама ведалі Капюшэнка і іншыя члены бюро, і не рэагавалі.

Члены бюро бачылі і чулі, як груба трымаў сябе Кацельнікаў у адносінах да радавых членаў партыі. Аднойчы з яго габінета адзін член партыі выйшаў і заплакаў. Тут ужо на вытрымаў культпроп Капюшэнка, ён рашыў рэагаваць. Ён уварваўся ў габінет Кацельнікава і заявіў яму, што так, моў, нельга. Кацельнікаў у адказ прапанаваў пакінуць гэта пытанне, а пакуль ісці... выпіць... І культпроп пайшоў. На гэтым справа і кончылася.

Другі член бюро Гуцаў таксама прызнаецца на партыйным сходзе ў недаглядзе, у адсутнасці пільнасці. Ён заявіў сходу, што ў яго некалькі разоў зараджалася думка, што Кацельнікаў — чалавек падазроны, што яго трэба выкрыць. Але, — працягвае Гуцаў, — я баяўся, бо за такія справы часам... б'юць (??). У такім паклёпе на партыю Гуцаў імкнуўся знайсці апраўданне свайму маўчанню.

Члены бюро, асабліва Гуцаў, Капюшэнка і Фрыдзон, ведалі аб сістэматычным очкаўтірацельстве і ў гаспадарчай, і ў партыйнай рабоце, якую культываваў Кацельнікаў, ведалі і, як гнілыя лібералы, прымірыліся з гэтай з'явай.

Члены бюро ведалі, што Кацельнікаў спрабаваў процінаставіць Дрысенскую партарганізацыю, а ў першую чаргу актыў, супроць акругкома партыі, ведалі і, як прымірэнцы, маўчалі, іншы раз нават патуралі гэтым настроям. Калі асобныя работнікі — Зейфман (намеснік начальніка МТС па палітчасці) асмельваліся на бюро акругкома крытыкаваць работу райкома, яго Кацельнікаў пры агульным адабрэнні іншых членаў бюро ўзнагароджваве мянушкай даносчыка.

Члены бюро ведалі, што Кацельнікаў зазекваецца над ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкай. Быў такі факт. Пракурор Астахаў на сходзе калектыва РВК чытаў Канстытуцыю СССР на беларускай мове. Кацельнікаў, які тут-жа прысутнічаў, вырваў у яго з рук газету і сказаў: «Што ты там бэкаеш па-беларуску — на вось чытай на рускай мове». Кацельнікаў аднойчы расказваў членам бюро, што зоркі на беларускім небе на зоркі не падобны. Яны ўсё гэта слухалі і, як гнілыя лібералы, маўчалі.

З усяго гэтага вынікае адзін вельмі сур'ёзны вывад для кожнага партыйнага работніка. Нельга абмежавацца размовамі налева і направа аб удзесяцярэнні пільнасці, не разгортваючы пры гэтым унутрыпартыйную дэмакратыю і большэвіцкую самакрытыку. Кожны член партыі, дзе-б ён ні працаваў, бачачы недахоп у рабоце, больш скажэнні лініі партыі, павінен рашуча і смела аб гэтым гаварыць, ніхай гэта датычыць парторга, члена бюро райкома, або сакратара райкома партыі. Наша партыя тым і моцная, што яна выхоўвае кожнага свайго члена, кожнага беспартыйнага рабочага і калгасніка ў духу самакрытыкі, не гледзячы на асоб. Там, дзе самакрытыкі няма, дзе працвітае сямейнасць, туды прабіраюцца ворагі нашай партыі, ворагі народу. Аб гэтым не глядна гаворыць урокі Дрысенскай партарганізацыі.

Б. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Праф. Н. А. ДАРОЖКІН

СТАХАНАЎЦЫ ЎНОСЯЦЬ ПАПРАЎКІ У АГРАТЭХНІКУ БУЛЬБЫ

У 1936 годзе ў БССР атрымалі рэкордны ўраджай бульбы, ад 2000 да 3400 пудоў больш 80 калгасаў на плошчы 300 гектараў, пры сярэдняй ураджайнасці 672 пуды на рэспубліцы.

Інстытутам біялогіі скончана ўсебаковае вывучэнне вопыту перадавых калгасаў БССР па атрыманню высокіх ураджаяў бульбы. Стаханаўцы па бульбе ўносяць рад грунтоўных паправак у існуючую агратэхніку бульбы. Неабходна, каб гэтыя папраўкі ўжо ў гэтым годзе зрабіліся здабыткам нашых калгасаў.

Возьмем велічыню клубняў для пасадкі. Брыгада навуковых работнікаў Інстытута бульбяной гаспадаркі ў кніжцы «Дапаможнік для брыгадзіраў па культуры бульбы», (выданне Сельхозгіза, Масква, 1934 г.), на старонцы 38 рэкамендуе — «Лепшай велічынёй пасадачнага клубня з'яўляецца клубень вагою ад 30 да 50 грам».

Стаханаўцы Шэршань Матвей і Ганчаравіч Аляксей з Барысаўскага раёна, а за імі і іншыя, рашылі ўзважыць клубні. Клубні па 30 і 50 грам тт. Шэршань і Ганчаравіч назвалі жалудзямі, а таму ў сваіх дзённіках запісалі: «Клубні такога памеру не ўжываць для пасадкі, а пасадку рабіць клубнямі велічынёй 70—150 грам, прычым абавязкова цэлымі, а не рэзанымі», што таксама рэкамендавалі многія вучоныя.

Ва ўсіх выпадках буйныя клубні далі добрыя рэзультаты. Цікава, ці вядома было, што больш буйныя клубні даюць больш высокі ўраджай?

Так, вядома. Але памылка большасці вучоных заключалася ў тым, што яны выходзілі з ніякай агратэхнікі, не ўлічвалі механізацыі працэсаў апрацоўкі глебы і таму лічылі, што пры ўдвая меншай плошчы харчавання можа атрымацца меншы ўраджай пры пасадцы дробнымі, у параўнанні з буйнымі клубнямі.

Што-ж у рэзультаце гэтага атрымалася? З года ў год пагаршалася якасць пасадачнага матэрыялу. Ад высеву дробнымі клубнямі рэзка падала ўраджайнасць, развіваліся вірусныя захворванні бульбы. Вось чаму раз назаўсёды трэба адмовіцца ад пасадкі клубнямі 30—50 грам. Найлепшым матэрыялам для пасадкі трэба лічыць клубні 70—100 грам. На рэкордных участках можна ўжываць клубні для пасадкі 150 грам. Між іншым, у калгасах БССР даўно адмовіліся ад пасадкі клубнямі ў 30—50 грам.

Пры разліку нормы ўгнаення на гектар пад бульбу літаральна ва ўсіх падручніках і кніжках рэкамендавалася 18—36 і максімальна 40 тон. Вышэй гэтай нормы лічылася нельга ўносіць, або таму, што, моў, бульба пойдзе ў батву, або таму, што не хопіць угнаенняў. І тое і другое аказалася няправільным. Усюды, дзе ўносіўся гной, асабліва тарфяны гной — 40—50 тон на гектар, быў атрыман ураджай больш 500 цэнтнераў з гектара. Прыстасаванне гэтага гною ўтваралася разам з мінеральнымі ўгнаеннямі.

Аказваецца, пры правільных суадносінах спажыўных матэрый (азота, фосфара, калія) зусім няма чаго баяцца, што бульба пойдзе ў батву. Гэта таксама было вядома, але зноў-такі, адна «маленькая» акалічнасць упускалася, гэта — высокая агратэхніка, якая стала магчымай дзякуючы буйнаму соцыялістычнаму земляробству, аснашчонаму машынамі.

Такім чынам і тут была арыентыроўка на нізкую агратэхніку. Што датычыць гною, дык таксама аказалася магчымасць яго знайсці, у асаблівасці ў нас, у Беларусі, дзе ёсць незвычарнальныя багацці торфу. І вось стаханаўцы ўносеиь і зімой нарыхтоўвалі торф, попел і іншыя мясцовыя ўгнаенні, што поўнасцю дало магчымасць не трымаць расліны на галодным пайку.

У радзе падручнікаў рэкамендуецца ўнясенне гною пад бульбу вясной. І гэта ўказанне з'яўляецца, па сутнасці, няправільным. Ва ўсіх стаханаўскіх звеннях на тых участках, дзе гной быў унесен з восені, або добра перапрэўшы, — ураджай быў больш высокі. Гэта асабліва яркa пацвярджаецца вопытам у калгасе «Чырвоны баец», дзе на 3-х гектарах было ўнесена ўгнаенне, якое добра разлажылася (торф з гноем), ураджай быў 538 цэнтнераў з гектара, а на 2-х гектарах, дзе гной быў унесен вясной — 480 цэнтнераў, пры ўсіх іншых аднолькавых умовах, гэта значыць розніца на 50 цнт. з гектара. Між іншым, уся гэтая бульба абслугоўвалася адным і тым-жа звяном тав. Ганчарэвіча. Глеба — лёгкі суглінак. Такія-ж рэзультаты атрыманы і ў калгасе «Чырвоная Рагатка», дзе торф 30 тон на гектар быў зааран восенню.

1936 стаханаўскі год, як ніколі, паказаў, што пры большэвіцкай барацьбе за ўраджай можна існуючы ўраджай бульбы павялічыць у 5 і больш разоў. У свой час **В. І. Ленін** з вычарпальнай яснасцю даказаў негрунтоўнасць высунутага буржуазным аканамістам Булгаковым «закона змяншаючайся пладароднасці глебы». Сутнасць гэтага «закона» зводзіцца да таго, што «кожнае дадатковае ўкладанне працы і капітала ў зямлю суправаджаецца не адпаведнай, а змяншаючай колькасцю здабываемага прадукта».

В. І. Ленін па поваду гэтай буржуазнай хлусні пісаў: «Закон змяншаючайся пладароднасці глебы зусім не прымянім у тых выпадках, калі тэхніка прагрэсіруе, калі спосабы вытворчасці пераўтвараюцца; ён мае толькі вельмі адноснае і ўмоўнае прыстасаванне ў тых выпадках, калі тэхніка астаецца нязменнай. Вось чаму ні Маркс, ні маркісты і не гаворыць аб гэтым «законе», а крычаць аб ім толькі прадстаўнікі буржуазнай навукі накшталт Брэнтана, якія ніяк не могуць адмовіцца ад забабон старой палітычнай эканоміі з яе абстрактнымі, вечнымі і прыроднымі законамі».

Нашы стаханаўцы сваёй выдатнай работай па разкаму павелічэнню ўраджайнасці соцыялістычных палёў яшчэ і яшчэ раз паказалі выключную праўдзівасць і геніяльнасць слоў В. І. Леніна.

На самой справе, у адных і тых-жа калгасах мы бачылі на стаханаўскіх участках ураджай і 500 і вышэй цэнтнераў, а тут-жа, побач, на звычайных пасевах — 100 цэнтнераў з гектара. Павелічэнне ў 5 раз. Ну, а як-жа з затратай працы ў перавозе на прападні?

Напрыклад, у калгасе «Хваля рэвалюцыі» на рэкордным участку затрачана на гектар 179 працадзён, а на звычайным—77 працадзён. Валавы ўраджай на рэкордным участку на кожны працадзень роўны быў 309 кгр. бульбы, а на звычайных пасевах — 194 кгр. У калгасе «Большэвік» на гектар рэкорднага ўчастка было затрачана 220 працадзён, а на звычайных пасевах — 120 працадзён. Валавы ўраджай на рэкордным участку на кожны працадзень быў роўны 240 кілограмаў, а на звычайным — 160 кілограмаў. Пры механізацыі працэсаў апрацоўкі, догляду за бульбай і ўборкі бульбы, натуральна расход працадзён значна скароціцца, а аплата працадня яшчэ больш павысіцца.

Такім чынам, няма «закона» зніжаючайся пладароднасці глебы. У руках соцыялістычнага земляробства, аснашчонага перадавой тэхнікай, выдатнымі стаханаўцамі сельскай гаспадаркі — сапраўдным сталінскімі пітомцамі, ёсць закон узрастаючай пладароднасці глебы.

Адсюль зразумела, што мы маем бліскучыя перспектывы для далейшага, яшчэ больш рашучага ўзняцця ўраджайнасці, на палепшанне сярэдняй ураджайнасці бульбы па рэспубліцы. Стаханаўскія звенні па атрыманню рэкордных ураджаяў бульбы ў калгасах павінны так сваю работу будаваць, каб у канчатковым выніку ў цэлым калгас стаў з рэкордным ураджаем бульбы — стаханаўскім калгасам і не толькі па бульбе, а па ўсіх культурах.

КАЛГАСНЫЯ КАВАЛЕРЫСТЫ

Дзесяць калгаснікаў у адзін момант селі ў сёдлы. Стройныя рысакі танцавалі пад сёдламі, не маглі ўстаяць на месцы.

І як толькі кавалерысты пусцілі паводдзі, рысакі кінуліся ў галоп. Халодны зімовы сустрэчны вецер рассыпаў іх прыгожыя грывы. А коні неслися ўперад, беручы на хаду любыя перашкоды.

Вось здалёк відаць высокі насып. Кавалерыст Белякоў крыху прыгінаецца сваім корпусам наперад. За ім следуюць усе астатнія коннікі. Яшчэ секунда, і перашкода ззаду.

... Практычныя заняткі кавалерыйскага гуртка ў калгасе «Чырвоныя Яромкавічы», Аршанскага раёна, праходзяць з вялікім поспехам. Першыя 10 кавалерыстаў-калгаснікаў, запісаўшыхся ў гурток, кожны тыдзень выязджаюць на конях у поле. Пасля работы яны вывучаюць ваенную справу, каб у любы момант засядлаць сваіх калгасных коней і разам са слаўнай чырвонай коннicай стаць на абарону дарагой і шчаслівай бацькаўшчыны.

Калгасныя кавалерысты за кароткі час ужо добра аўладалі тэхнікай рубкі, манежнай язды, пасадкі на каня. Былы кавалерыст, дэмабілізаваны чырвонаармеец, зараз калгаснік Белякоў арганізаваў сістэматычную вучобу. Да яго прыходзяць калгаснікі і калгасніцы і просяць запісаць іх у гурток вярашылаўскіх кавалерыстаў.

— Мы хочам навучыцца па-варашылаўску ездзіць на кані і па-варашылаўску валодаць клінком, — заяўляюць калгаснікі.

У калгаснікаў расце вялікая зацікаўленасць конным спортам. І калі кавалерысты выязджаюць на конях у поле, іх праводзяць усім калгасам. Калгаснікі ратуюцца лоўкасці сваіх коннікаў, якія смела бяруць вялікія перашкоды, без промаху скокуць лазу на абодва бакі.

— Пападзіся пад руку галава фашыста, у адну мінуту будзе адсечана, як качан капусты. — усміхаючыся гаворыць калгаснік.

***

У калгасах Аршанскага раёна арганізавана 6 гурткоў варашылаўскіх кавалерыстаў. Есць добрыя ваенізаваныя канюшні.

Гурткі варашылаўскіх кавалерыстаў і ваенізаваныя канюшні арганізаваны інструктарам райсавета Асоавіяхіма Бялюгаевым Бікенцієм. Тав. Бялюгаў — калгаснік сельскагаспадарчай артэлі «Парыжская комуна» — скончыў школу варашылаўскіх кавалерыстаў пры Цэнтральным савеце Асоавіяхіма БССР.

Да дня 1 мая гурткі варашылаўскіх кавалерыстаў арганізуюцца яшчэ ў 14 калгасах раёна. Будзе створан першы ў Аршанчыне эскадрон калгасных коннікаў, якія прадэманструюць сваю гатоўнасць разам з усёй Чырвонай Арміяй даць рашучы адпор ворагам, якія паімкнуцца напасці на сацыялістычную радзіму. **А. ЛОСЬ.**

УЗОРНА ЗАХОЎВАЦЬ АРХІЎНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Ленінскія лекраты ад 1 чэрвеня 1918 г. і ад 31 сакавіка 1919 г. і наступныя рашэнні ўрада аб архіўнай справе з усёй яснасцю паказваюць, якую вялікую ўвагу ўдзяляюць наша партыя і ўрад упарадкаванню, захаванасці і спарыстанню архіўных матэрыялаў.

За апошні час у БССР праведзена вялікая работа ў галіне арганізацыі архіўнай справы. За 1936 г. арганізаваны 76 раённых архіваў, для якіх падрыхтаваны звыш 60 работнікаў. Гэта дало магчымасць выяўленню цэлага раду каштоўнейшых матэрыялаў.

Побач з гэтым неабходна адзначыць, што ў радзе месц асобныя кіраўнікі недаацэньваюць гістарычнага значэння архіўных матэрыялаў і ўтрымліваюць архівы ў неўпарадкаваным, хаатычным становішчы. У радзе раёнаў, як Асвейскі, Мсціслаўскі, Горацкі, Ветрынскі інш., да гэтага часу не арганізаваны раённыя архівы. У Менску архівы Наркомаховы здароўя, Белгазпромбуда, завода імя Мяснікова раскіданы па падвалах і псуюцца.

Для паляпшэння ўтрымання і захавання архіўных матэрыялаў Цэнтральнае архіўнае кіраўніцтва БССР арганізуе правядзенне раённых нарад справаводаў і сакратароў устаноў. 24 лютага такая нарада праведзена ў Бабруйскім раёне. Удзельнікі нарады звярнуліся да ўсіх кіраўнікоў, справаводаў і сакратароў арганізацый, да старшынь і рахункаводаў калгасаў з заклікам, каб на працягу сакавіка і красавіка ўпарадкаваць па ўсіх правілах пастаноўку архіўнай справы.

Трэба думаць, што выклік работнікаў Бабруйскага раёна будзе падхоплен усімі ўстановамі і арганізацыямі БССР.

ПАПОЎ.

ПА РАЁННЫХ ЦЭНТРАХ

БУДА-КАШАЛЕВА

Тут калісьці стаяла ўбогая вёска з нізкімі хаткамі, з саламянымі дахамі. Перавага гэтай вёскі заключалася толькі ў тым, што яна знаходзілася каля чыгуначнай станцыі Буда-Кашалева. Але праімчыцца поезд, рэха гудка адгукнецца ў лесе, і зноў надыходзіла санлівая цішыня. Людзі жылі ў маленькіх хібарках, якія нагадвалі будкі, і адсюль, па сцвярджэнню старажылаў, пайшла назва «Буда».

Рост Буда-Кашалева пачаўся, калі ён стаў раённым цэнтрам. Над дахамі хатак узвысіліся першыя стройныя будынкі Дома совета, банка, корпуса МТС і школы. Даве вуліцы атрымалі назвы: 1-я Комунальная і 2-я Комунальная. Мястэчка пачало прымаць выгляд культурнага, упарадкаванага раённага цэнтра. Яно вырайнівалася і ўпрыгожвалася. Асабліва мястэчка змяніла сваё аблічча ў 1936 годзе. Былі пабудаваны за мінулы год будынкі—РК ЛКСМБ, гасцініцы, гаража, лазні МТС, гантарэзны завод з электрастанцыяй. Толькі за другое паўгоддзе пабудавана каля 120 новых жыллёвых дамоў. Вуліцы абсадзілі трыма тысячамі дэкаратыўных дрэваў і па абодвух баках праклалі тратуары. За адзін 1936 год насельніцтва мястэчка вырасла з 1.850 чал. да 3.100 чал. Так, натуральна, нарадзілася неабходнасць найменавання вуліц.

Дата 5 студзеня 1937 года знамянальная для жыхароў Буда-Кашалева. У гэты дзень пастановай РВК зацверджаны назвы 10 вуліц. Гордыя і ганаровыя назвы атрымалі вуліцы адроджанага мястэчка. Совецкая, вул. Горкага, Комсамольская, Ленінская, Калгасная, Інтэрнацыянальная. Даве зусім новыя вуліцы, вырасшыя ў 1936 годзе, названы імёнамі вялікіх рускіх людзей: Пушкінская і Ламаносаўская. Каля чыгуначнай станцыі з'явіліся вуліцы Залінейная і Вакзальная.

Няма глухой вёскі, ёсць новы растучы раённы цэнтр.

Н. ГАСМАН.

ДАСТОЙНЫ ПАСТУПАК

СІРОЦІНА. (Кар. «Звязды»). 22 лютага калгасніку калгаса «Ленінец» т. Гусакову Даніілу саламарэзкай адрэзала руку. Пацярпеўшы быў дастаўлен у м. Шумілінна, дзе яму аказалі першую дапамогу. Але становішча хворага было вельмі трывожнае. Яму неабходна было аказаць кваліфікаваную хірургічную дапамогу. Паязды на Віцебск і Полацк прайшлі, дарога была заносена снегам і на машыне нельга было праехаць. Тады ўзяўся дапамагчы начальнік станцыі Сіроціна т. Іваноў. Ён з суседняй ст. Обаль тэрмінова выклікаў паравоз, на якім у суправаджэнні медыцынскай сястры Трэцяковай тав. Гусакоў быў дастаўлен у г. Полацк, дзе яму была аказана хірургічная дапамога.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Творчасць Юрыя Майсеевіча Пэна

Піонер.

ПУШКІН У МАЛЮНКАХ

У адзнаку стагоддзя з дня смерці А. С. Пушкіна віцебскі мастацкі тэхнікум арганізаваў выстаўку на тэму: «Пушкін у малюнках і ілюстрацыях». Каля 50 студэнтаў тэхнікума выставілі свае работы, галоўным чынам, ілюстрацыі да твораў вялікага рускага паэта — «Дуброўскі», «Станцыйны наглядчык», «Палтава», «Бахчысарайскі фантан», «Цыганы» і т. д.

ВОПЫТНЫЯ ЎЧАСТКІ РЭКОРДНЫХ УРАДЖАЯЎ

Беларуская вопытная станцыя палявоства разгарнула падрыхтоўчую работу па закладцы ў калгасах вопытных участкаў рэкордных ураджаяў. Такія ўчасткі будуць закладзены ў 9 раёнах БССР — Сіроцінскім, Асіповіцкім, Гомельскім, Слуцкім і інш. па бульбе і яравых зернавых (пшаніца яравая, ячмень, авёс).

Для правядзення навукова-агранамічных мерапрыемстваў станцыя вылучыла 23 навуковых работнікаў і тэхнікаў.

ПЛАНТАЦЫІ ХМЕЛЯ

Броварная прамысловасць БССР увесь час працуе на прывазным хмелі, які завозіцца з УССР, Маскоўскай вобласці і інш. мясцовасцей Саюза. Перад калгасамі рэспублікі паставлена задача задаволіць у бліжэйшыя гады броварныя заводы мясцовым хмелем. У мінулым годзе, як дослед, у 8 калгасах Менскага раёна на плошчы 10 гектараў былі закладзены першыя калгасныя плантацыі хмеля.

Не глядзячы на тое, што хмель поўны ўраджай дае на 4—5 гаду росту (у гэты час яго ўраджай дасягае да 14 цэнтнераў з гектара і больш), калгасы імя Калініна, «Перамога», імя Леніна, і інш. у першым годзе знялі звыш цэнтнера хмеля з гектара і выручылі ад продажу яго дзяржаве больш чым па 1000 руб. Па сваіх якасцях хмель, вырашчаны ў калгасах Меншчыны, нічым не ўступае завазному хмелю.

У гэтым годзе плантацыі хмеля ў калгасах Менскага раёна пашыраюцца да 35 гектараў, а ў калгасах Магілёўскага раёна ўпершыню будзе засеяна 5 гектараў хмеля. Хмель можа добра расці не толькі ў гэтых раёнах, а амаль ва ўсіх раёнах паўднёвай часткі БССР.

БЕЗАЛКАЛОІДНЫ ЛУБІН У БССР

Беларуская даследчая станцыя «Зазер'е» з'яўляецца радзімай бэзалкалоіднага лубіну ў БССР. У 1931 годзе навуковы работнік станцыі тав. Свірскі з скірды скошанага лубіна знайшоў тры расліны з безалкалоідным насеннем. У 1932 годзе безалкалоіднага лубіну сабралі 200 грам, у 1933 г. — 800 грам, у 1935 г. каля 1000 пудоў. Гэтым насеннем у 1936 годзе была засеяна плошча ў 250 гектараў па соўгасах Белнасентраста.

У гэтым годзе запланіравана пасеяць 500 гектараў безалкалоіднага лубіну матэрыялам эліты і першай рэпрадукцыі.

Зараз тав. Свірскі працуе над вывядзеннем жоўтага безалкалоіднага лубіну, які мае каля 50 проц. бялка. Жоўтага безалкалоіднага лубіну (насення) ёсць 5 цэнтнераў.

Цікавая і каштоўная работа праводзіцца па вывядзенню шматгадовага безалкалоіднага лубіну. Гэты лубін вельмі каштоўны тым, што ён можа культывавацца далёка на поўначы.

В. КАРНІЛАЎ.

ДА ПАСТАНОЎКІ Ў МЕНСКУ „СВАДЬБЫ ФИГАРО"

Беларускі радыёкамітэт запрасіў артыстычны калектыў Усесаюзнага радыёкамітэта для канцэртнай пастаноўкі оперы Моцарта «Свадьба Фигаро». Пастаноўка адбудзецца ў Менску 12 сакавіка.

Кампазітар Моцарт належаў да ліку прыдворных музыкантаў. Яго гаспадар, зальцбургскі архіепіскап, бязлушны тыран, трэніраваў, усяляк прыгнятаў геніяльнага кампазітара і патрабаваў беспярэчлівай пакорлівасці. Многія музыканты пярпліва заносілі здзекі «высокіх» асоб, але Моцарт быў слабе інакш. Выхадзец з нізоў грамадства, ён усведамляў сваю перавагу над прывілеяванымі асобамі і горда адстойваў сваё дастоінства як чалавека і мастака. Ніцшэнт з графам Арко, прыбліжаным архіепіскапа, дасканала характарызуе ўзаемаадносіны Моцарта «з верхнімі саямі грамадства». Сіяцельны граф дазволіў сабе гнусны ўчынак: пінком нагі выставіў кампазітара за дзверы. Абураны Моцарт пакляўся адпомсціць пагодніку «Чалавека аблагараджвае сэрца» —пісаў ён бацьку па гэтаму поваду. «Нехай я не граф, але ў душы ў мяне можа быць больш дастоінства, чым у іншага графа— будзь ён лакей або граф, калі ён мяне зневажае, ён мярзавец». Гэта імпэтная думка пасутнасці і ляжыць у аснове оперы «Свадьба Фигаро».

Граф Альмавіва, знатны і багаты вяльможа, дабіваецца кахання Сузаны прыгожай служанкі сваёй супругі. Каб вынудзіць у яе згоду, ён пагражае расстроіць ужо назначанае вяселле Сузаны з Фігаро. Слуга ўстае на абарону сваёй нявесты. Паміж ім і яго панам завязваецца патаемная, але вострая барацьба. Прадпрыймальны камердзінер пускае ў ход усю сваю энергію і знаходлівасць. Яму ўдаецца не толькі выпутацца самаму з цяжкіх акалічнасцей, але і выкрыць перад усімі распуснага вяльможу.

Такава ў самых агульных рысах асноўная канва багатага астраўмнымі і напружанымі палажэннямі сюжэта. У «Свадьбе Фигаро» Моцарт стварыў выдатную галерэю вобразаў. Для музыкальнага раскрыцця гэтых вобразаў Моцарт выкарыстоўвае бліскучыя ансамблі, вырэзныя арыі. Амаль кожная арыя ў «Свадьбе Фигаро» не проста музыка з тэкстам. Арыі маюць свой музыкальны сюжэт, вельмі часта прадстаўляючы сабой закончаны яркі расказ, характарызуючы той або іншы персанаж. Такавы, напрыклад, арыі Дон Базіліо, графіні і т. д. Асобна трэба сказаць аб ансамблях у оперы Моцарта. Для яго ансамблі служаць важным сродкам драматычнага выражэння. Ансамблі даюць магчымасць Моцарту паказаць героя ў яго ўзаемаадносінах з іншымі дзейнічаючымі асобамі. У «Свадьбе Фигаро» ансамблі звычайна суседаюць з момантамі найбольш моцнага развіцця дзеяння і чым бліжэй справа ідзе да кульмінацыі, чым больш ускладаецца інтрыга, тым больш разгалінёнымі становяцца ансамблі.

Опера ідзе ў канцэртным выкананні (без дэкарацый, грыму і касцюмаў). Аднак, пастаноўка яе не абмяжоўваецца толькі музыкальным выкананнем — дзейнічаючыя асобы оперы граюць, захоўваючы ўсе патрабаванні сцэнічнай игры. У Маскве опера ішла з вялікім поспехам. Пастаноўка оперы распрацавана як музыкальна, так і ражысерскі дырыжорам Георгам Себасцьянам, пастаноўкай-жа ў Менску кіруе Лео Гінзбург.

У оперы «Свадьба Фигаро» асноўныя галоўныя ролі выконваюць салісты Усесаюзнага радыёкамітэта: Фігаро — Абрамаў, Сюзана — Аматава, графіня — Раждзественская, граф Альмавіва — Дэйнека, Керубіно—Казанцава, Базіліо—Пантрагін, Бартало — Озераў, Марцэліна — Адзеркас, Антоніо — Антаненка, Курцио — Неўскі. Сімфанічны аркестр Беларускага радыёкамітэта — дырыжэр прафесар Маскоўскай кансерваторыі Лео Гінзбург.

Арганізацыя Беларускім радыёкамітэтам пастаноўкі ў Менску оперы Моцарта «Свадьба Фигаро» прадстаўляе велізарны музыкальны інтарэс для ўсіх радыёслухачоў БССР.

Г. РАГІНСКАЯ.

Жаночыя хімічныя спаборніцтвы

У адзнаку 8 сакавіка Цэнтральны совет Асоавіяхіма БССР арганізуе Усебеларускія жаночыя хімічныя спаборніцтвы. У Менску ўжо разгарнулася работа па фарміраванню і трэніроўцы жаночых каманд. Спаборніцтвы будуць праводзіцца па двух відах: змена працівагазаў у атмасферы атрутных вяшчэстваў і бег у працівагазах на 60 метраў. Кожная каманда будзе складацца з 6 жанчын.

Усебеларуская калгасная спартакіяда

4 сакавіка ў Менску на Усебеларускім стадыёне адкрылася другая Усебеларуская зімовая спартакіяда калгасных фізкультурнікаў па лыжах і стральбе. Спаборніцтвы пачаліся эмешанай ваенізаванай эстафетай. Лепшы час на 5 кіламетраў у эстафеце паказаў калгаснік калгаса «Чырвоныя Скарыпічы» Менскага раёна тав. Чуеўскі — 24 мінуты 55,2 сек. Сёння — лыжныя гонкі на 10 і 20 кіламетраў для мужчын і на 3 і 5 кіламетраў для жанчын. Заўтра ў памяшканні Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра адбудзецца ўрачыстае закрыццё спартакіяды і падпісанне дагавору на соцспаборніцтва паміж калгаснікамі-фізкультурнікамі БССР і Маскоўскай, Кіеўскай і Заходняй абласцей.

БАЛЕТ „САЛАВЕЙ"

Лібрэта балета «Салавей» (па аднаімённаму твору пісьменніка Бялулі) піша балетмейстар БДТ оперы і балета тав. Крамарэўскі сумесна з кампазітарам т. Крошнерам які піша музыку да гэтага балета. Лібрэта будзе закончана да 10 сакавіка.

ЗДАРЭННІ

⊙ **Вышукны сабака раскрыў пакражу.** Шляхам разбору фундамента злодзеі праніклі пад падлогу і абакралі магазін № 1 Папярнянскага сельпо, Менскага раёна. Усе сляды злачынцаў былі замецены снегам. На месца прыбыў праваднік Крымкушука тав. Меляшкевіч са сваім вышукным сабакам «Тома». Узяўшы след з-пад падлогі «Тома» выбег на вуліцу, пачаў брахаць на стаячага сярод групы людзей гр-на Камароўскага А. І., жыхара хутара Куты Папярнянскага сельсовета, у якога і была знойдзена частка пакрадзеных рэчаў. Праз некалькі дзён былі знойдзены і астатнія рэчы, схаваныя ў полі пад снегам, а таксама і схаваўшыся яго сын Грыгорый. Злодзеі Камароўскія —бацька і сын — арыштаваны і прыцягваюцца да адказнасці.

Ад Сталінскага РК КП(б)Б

Партбілет № 0872357, выданы Сталінскім РК КП(б)Б горада Менска на імя тав. **Крупадзерава** Майсея Александравіча, лічыць несапраўдным.

Сакратар Сталінскага РК КП(б)Б.
Н. ЛІТВІН.

ДЗЕННІК

Консультацыя для рэдактароў шматтыражак і насценных газет па пытанню выпуску газет да Міжнароднага жаночага дня адбудзецца 5 сакавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
6 сакавіка Абан. № 56
ПЛАТОН КРЭЧЭТ

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
ЗАКАТ
Абанемент № 84.

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінатэатр
САПРАЎДНЫ ТАВАРЫШ

Гукавы кінатэатр „Пралетарый"
ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ЗЯМЛЯ Ў ПАЛОНЕ

Гукавы кінатэатр «Спартак»
ДВА ДНІ

РАДЫЁПЕРАДАЧА НА 6 САКАВІКА
8-30 — «Апошнія навіны». 10-20 — канцэрт па заяўках дзяцей. 16 — канцэрт па заяўках радыёслухачоў. 17-15 — перадача на яўрэйскай мове аб Міжнародным комуністычным жаночым дні 18-15 — міжнародны агляд. 18-30 — рэвалюцыйныя песні. 19 — вершы Рафаэля Альберці.

Тропкі Владзімір Александравіч, ураджэнец г. Жлобіна, у сучасны момант праживае ў г. Менску, мяняе прозвішча на **Карвінкі.** Асоб, якія маюць пратесты да імены прозвішча, просяць паведаміць у Менгарэаге.

Згодна пастановы ўрада СССР, соўгас «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», Жыткавіцкага раёна

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Установы і асобы, якія маюць прэтэнзіі, павінны прад'явіць іх у ліквідком **да 10 сакавіка 1937 года,** пасля чаго прэтэнзіі прымацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ.

Менская кантора БЕЛПРАМГАНДЛЯ
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
ДА МІЖНАРОДНАГА ЖАНОЧАГА ДНЯ 8 САКАВІКА
ПРЫБЫЛІ РОЗНЫЯ ТАВАРЫ:

ВЕРХНІ І НІЖНІ ТРЫКАТАЖ, ПЛАЦІЦІ, БЛУЗКІ, ДЗІЦЯЧЫ ТРЫКАТАЖ І ПЛАЦІЦІ, АБУТАК РОЗНЫ — ЖАНОЧЫ І ДЗІЦЯЧЫ. ПАРФУМЕРЫЯ — ДУХІ, АДЭКАЛОН, МЫЛА ТУАЛЕТНАЕ І РОЗНЫЯ ІНШЫЯ ТАВАРЫ.

ПАТРАБУЙЦЕ Ў НАШЫХ МАГАЗІНАХ:
№ 1 — дзіцячы універмаг — ЛЕНІНСКАЯ, 1/9, тэл. № 25-747.
№ 3 — гатовае плацце, трыкатаж, парфумерыя, галантарэя — ЛЕНІНСКАЯ, 9/2, тэл. 22-421.
№ 44 — трыкатаж, галантарэя, парфумерыя — ЛЕНІНСКАЯ, 22.
№ 11 абутак, галошы—ЛЕНІНСКАЯ, 4.
№ 29 — галантарэя, трыкатаж, парфумерыя — ЛЕНІНСКАЯ, 4.

У МЭТАХ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ПАКУПНІКОЎ, ПЕРАЛІЧАНЫЯ МАГАЗІНЫ ДАСТАЎЛЯЮЦЬ КУПЛЕНЫ ТАВАР ПАКУПНІКАМ ПА ДОМ БЯСПЛАТНА.

ЯЎРЭЙСКАЯ АЎТАНОМНАЯ ВОБЛАСЦІ (ДВК)
для сістэмы АБЛЛЕСПРАМСАЮЗА
ПАТРЭБНЫ:
ІНЖЫНЕР па ЛЕСАЭКСПЛААТАЦЫІ,
ІНЖЫНЕР-ЛЕСАТРАНСПАРТНІК.
За даведкамі звяртацца ў Белкамзет (Менск, Дом урада, другі паверх, пакой № 253, тэл. № 24-524).

Сёння, 5 сакавіка, у 19 гадзін у Белдзяржтэатры
АДКРЫВАЕЦЦА
III УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД АСОАВІЯХІМА
Пасяджэнне партгрупы дэлегатаў з'езда адбудзецца ў 18 гадзін у Доме Чырвонай Арміі (пакой 42, 4 паверх).
ОРГКАМІСІЯ.

25 мая — ПЕРШЫ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ
(ВЫПУСК ЧАЦВЕРТАГА ГОДА)
АД НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА ФІНАНСАЎ САЮЗА ССР
З прычыны таго, што пераважная маса трымальнікаў дзяржаўных пазык правяла ўжо ў сувязі з канверсіяй абмен аблігацый раней выпушчаных унутраных дзяржаўных пазык на аблігацыі Пазыкі Другой Пяцігодкі (выпуск чацвертага года), а таксама ўлічваючы, што аблігацыі гэтай пазыкі па падпісцы 1936 г. будуць разданы ўсім падпісчыкам у першай палове мая г. г.
ПЕРШЫ ТЫРАЖ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ
(выпуск чацвертага года)
прызначаецца на 25 мая 1937 г. у Маскве.
ТРЫМАЛЬНІКІ ДЗЯРЖПАЗЫК, ЯКІЯ ЗДАЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАД ССУДЫ І НЕ ПАГАСЯЦЬ ССУДЫ ДА ПАЧАТКУ ТЫРАЖУ, ПАЗБАВЛЯЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ТЫРАЖАХ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ЗАКЛАДЗЕНЫХ ІМІ АБЛІГАЦЫЯХ ДЗЯРЖПАЗЫК.
У ВАДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

ПАСТАНОВА № 7

ГАЛОЎНАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ САНІТАРНАЙ ІНСПЕКЦЫІ БССР
ад 28 лютага 1937 г.

АБ ПЕРАВОЗЦЫ ГАТОВЫХ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ І ПОЎФАБРЫКАТАЎ

I. Наглядаецца рад выпадкаў грубага парушэння санітарных правілаў перавозкі гатовых харчовых прадуктаў і поўфабрыкатаў буфетам, магазінам, ларкам і т. д. як у г. Менску, так і ў іншых гарадах БССР.

II. Як прыклад: 26 лютага 1937 г. на вуліцы г. Менска была затрымана павозка фабрыкі-кухні з прадуктамі, прызначанымі для буфетаў Універсітэцкага гарадка, жараная рыба — 500 порцый, халоднае — 136 порцый, пончыкі — 150 шт., каўбаса, кандзіперскія вырабы і іншыя прадукты.

Азначаныя прадукты знаходзіліся непакрытымі, у бруднай, ломанай і непрыстасаванай тары. Аналагічная перавозка наглядаецца і за Трэстам кафе-рэстаранаў, Менгархарчгандлем, праўленнем буфетамі Дома ўрада і іншымі арганізацыямі г. Менска.

III. Пры такой перавозцы прадукты забруджваюцца і інфекцыруюцца. Спажыванне інфекцыраванага прадукта можа выклікаць інфекцыйнае захворванне і атручванне.

Выходзячы з вышэйадзначанага, **пастанаўляю:**

1. Дырэктара фабрыкі-кухні т. **Плоткіна** і нам. дырэктара па санітарнай частцы ўрача **Сабалеўскую,** якія не прымалі мер па забеспячанню перавозкі харчовых прадуктаў у адпаведных санітарных умовах, не гледзячы на рад прапаноў Дзяржсанінспекцыі, падвергнуць адмспагнанню—штрафу, т. **Плоткіна на 100** р. і т. **Сабалеускую на 75** р.

2. Загадчыка экспедыцыі т. **Ваймана** і экспедытара т. **Шыбера** за грубае парушэнне санітарных правілаў перавозкі харчовых прадуктаў падвергнуць адмспагнанню — штрафу: т. **Ваймана на 100** руб., т. **Шыбера на 50** р.

3. Папярэдзіць усіх кіраўнікоў арганізацый і асоб, якія праводзяць перавозку харчовых прадуктаў што пры парушэнні санітарных правілаў перавозкі прадуктаў, яны будуць прыцягвацца да суровай адказнасці.

4. Дзяржсанінспектарам гарадоў і раёнаў БССР у сакавіку месяцы праверыць становішча транспарту перавозкі харчовых прадуктаў, прыняць адпаведныя меры, і вынікі прыслаць к 1 красавіка г. г. у Галоўную Дзяржсанінспекцыю БССР.

Нам. галоўнага дзяржсанінспектара БССР
СЕРКОВА.

Уп. Галоўлітбела № К—582. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 83. К. К. С.